
ПРЫЯРЫТЭТЫ ПОШУКАВАГА РУХУ 4

ЗАЛАТОЕ РАМЯСТВА 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 КРАСАВІКА 2024 г. АЎТОРАК № 85 (30219)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Мы бачым, наколькі запатрабаваны на рынку працы прафесіяналы рабочых прафесій. Сёння робіцца ўсё, каб для навучэнцаў, якія заканчваюць 9 класаў, паступленне ў каледжы было найбольш важнай адукацыйнай траекторыяй. Сістэма вышэйшай адукацыі цяпер па даручэнні кіраўніка дзяржавы праходзіць поўную рэвізію. У ВНУ вядзецца праверка. Мы будзем гатовы не проста далажыць Прэзідэнту аб праблемных пытаннях, якія ёсць (яны таксама былі акрэслены на пашыраным пасяджэнні рэспубліканскага Савета рэктараў), але і прапанаваць і пачаць выконваць ужо канкрэтныя даручэнні па вырашэнні гэтых пытанняў».*

# Сумленная праца дзеля Радзімы

*Паважаныя суайчыннікі!*

*Сардэчна віншую вас са Святам працы.*

*Беларускі народ ва ўсе часы славіўся працавітасцю і гаспадарлівым падыходам да справы, што дазволіла нам уладкаваць сваю дзяржаву і захаваць мір на роднай зямлі.*

*Сёння, калі абвастрылася глабальная канкурэнцыя за рынкі і рэсурсы, асабліва важна ўмацаваць наш агульны дом, прымножыць дастатак грамадзян, забяспечыць шчаслівую будучыню дзецям і ўнукам. Гэта магчыма дзякуючы добрасумленнаму і адказнаму стаўленню да даручанага ўчастка работы, настойлівасці ў дасягненні пастаўленых мэт, наватарскаму падыходу да вырашэння паўсядзённых задач.*

*Значным фактарам умацавання беларускай мадэлі грамадскага развіцця з'яўляецца сацыяльнае партнёрства і канструктыўны дыялог органаў дзяржаўнай улады і прафсаюзнага руху, які адзначае сваё 120-годдзе.*

*Упэўнены, працягваючы традыцыі пакаленняў пераможцаў, мы замацуем за Рэспублікай Беларусь славу моцнай, сучаснай і тэхналагічна развітой краіны.*

*У гэты святочны дзень дзякую кожнаму, хто адданы справе і штодня сваёй працай робіць унёсак у росквіт нашай Радзімы.*

*Жадаю новых здзяйсненняў і прафесійных перамог. Міра і дабрабыту вам і вашым сем'ям.*

*З Першамаем!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Швейнае прадпрыемства «Калінка» з Салігорска добра вядомае ў нашай краіне і за яе межамі — зручнае прыгожае адзенне з задавальненнем носяць і дарослыя, і дзеці. Напэўна, многія думаюць, што працуюць на гэтай вытворчасці выключна жанчыны. Але гэта зусім не так. Напрыклад, **Сяргей ТАМІЛА** — раскройшчык 7 разрада. Ён працуе на аўтаматычным раскройным комплексе, і гэта работа патрабуе пастаяннай сканцэнтраванасці і дакладнасці.

## КОРАТКА

- Паступленні падаткаў у Мінску ў I квартале ўзраслі на 17 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.
- **Раннія яравыя збожжавыя ў Беларусі пасеялі на 90 % плошчаў.**
- Старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна Лугіна правяла перагаворы з кіраўніцтвам індыйскай кампаніі Rishab World Pvt Ltd па пытанні супрацоўніцтва з тэкстыльнымі прадпрыемствамі ў сферы вытворчасці тканін з лёну і воўны і гандлю імі.
- **Матэрыяльную дапамогу да 9 Мая атрымалі 98 % ветэранаў, былых вязняў фашызму, членаў сем'яў вайскоўцаў, загінулых у гады вайны.**


ISSN 1990 — 763X


Соцыум

## УВАЖЛІВАСЦЬ І ПРАВІЛЫ БЯСПЕКІ

### Менавіта яны — галоўны фактар зніжэння вытворчага траўматызму

**Выпадкі траўміравання і гібелі на вытворчасці найчасцей здараюцца ў такіх галінах, як прамысловасць, сельская гаспадарка, будаўніцтва і транспарт. Па агульным траўматызме ў лідарах прамысловасць, смяротныя выпадкі найчасцей здараюцца ў будаўніцтве і сельскай гаспадарцы. Пры тым, што змяншаецца колькасць траўматызму па віне работніка і наймальніка, расце ўдзельная вага выпадкаў, калі работнік атрымлівае траўму па неасцярожнасці. На сёння гэта кожны пяты выпадак траўміравання. Напярэдадні свята працы спецыялісты падзяліліся лічбамі па колькасці траўм на вытворчасці і назвалі іх асноўныя прычыны.**

#### ЛЕПШ НЕ ХАВАЦЬ

Як адзначыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ**, у 2022 годзе ў рамках Міжнароднай арганізацыі працы было прынята рашэнне, што пытанні аховы працы будуць аднесены да асноватворных нормаў у гэтай сферы.



СТАР. 7

У сезон

## КРЫЛАТЫЯ АРЭЛІ

### Ад чаго залежыць бяспека атракцыёнаў?

**Калі настроіцца на вясновую хвалю пакуль не атрымліваецца, паспрабуйце пакатацца на атракцыёнах. Сезон атракцыёнаў — 2024 у Беларусі афіцыйна можна лічыць адкрытым. У Мінску яны пачалі работу ў мінулую пятніцу, 26 красавіка. Спецыялісты, якія адказваюць за бяспеку адпачынку, расказалі, якія прыемныя сюрпрызы чакаюць нас гэтым летам і як пазбегнуць сюрпрызаў непрыемных.**

Калі вы, паднімаючыся над горадам на коле агляду ў парку Горкага ці за секунду да таго, як ухнуць уніз з самай высокай горкі «Супер-8» у парку Чалюскінцаў, лавілі сябе на думцы: «Цікава, а ці правяраецца ўся гэтая махіна на знос і «стомленасць» матэрыялу?», то адказ — так, і праверкі праводзяцца рэгулярна. Як мінімум напярэдадні кожнага новага «паркавага сезона». Адказвае за «тэсціраванне» каруселяў Дэпартамент па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці — орган, упаўнаважаны на ажыццяўленне дзяржаўнага нагляду за забеспячэннем бяспекі атракцыёнаў.



СТАР. 8

# СІСТЭМА ПАВІННА БЫЦЬ ВЫБУДАВАНА

**Прэзідэнт Беларусі, Старшыня Усебеларускага народнага сходу Аляксандр Лукашэнка 29 красавіка па селектарнай сувязі заслухаў даклад намесніка Старшыні УНС Аляксандра Косінца і начальніка сакратарыята Валерыя Міцкевіча. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

У развіццё першага пасяджэння VII Усебеларускага народнага сходу, якое прайшло 24-25 красавіка, беларускі лідар паставіў шэраг задач, акрэсліўшы галоўныя пытанні, над якімі неабходна працаваць у рамках новага канстытуцыйнага органа.

**Па-першае**, Аляксандр Лукашэнка даручыў выбудаваць сістэму работы з дэлегатамі УНС па вертыкалі «старшыня — намеснік — сакратарыят — дэлегаты УНС». У склад сходу ўваходзяць каля 1,2 тыс. дэлегатаў. Гэта людзі самых розных сацыяльных груп, у тым ліку дэпутатаў мясцовых саветаў, прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці. «Сістэма работы з імі павінна быць выбудавана, — так Прэзідэнт абазначыў адну з галоўных задач. — Не ад сходу да сходу, а на пастаяннай аснове, уключаючы інфармаванне дэлегатаў, зваротную сувязь, графік сустрэч і гэтак далей».

**Задача нумар два** — выбудоўванне структуры для арганізацыі работы УНС. Яна павінна быць мінімальнай, але, безумоўна, эфектыўнай. У сувязі з тым, што асноўны орган, які займаецца арганізацыйнай работай УНС, — яго сакратарыят — будзе малалікім, пастаўлена задача арганізаваць сістэму ўзаемадзеяння з дзяржорганамі, губернатарамі, мясцовымі органамі ўлады, суб'ектамі грамадзянскай супольнасці.

**У тэму**

## ДЭЛЕГАТЫ ПОЙДУЦЬ У НАРОД

Дэлегаты УНС пойдуць у народ, у працоўныя калектывы, ва ўстановы і арганізацыі, каб тлумачыць палітыку дзяржавы і рашэнні УНС. Аб гэтым заявіў журналістам намеснік старшыні Усебеларускага народнага сходу Аляксандр Косінец па выніках праведзенага па селектарнай сувязі даклада Прэзідэнту Беларусі, Старшыні Усебеларускага народнага сходу Аляксандру Лукашэнку, паведамляе БелТА.

Адна з задач, якую паставіў кіраўнік дзяржавы, датычыцца выбудоўвання структуры для арганізацыі работы УНС. У сувязі з гэтым Аляксандр Косінец звярнуў увагу на ролю і функцыі Прэзідыума УНС. Ён уключае 15 чалавек, з якіх толькі адзін працуе на прафесійнай аснове (намеснік старшыні УНС), а астатнія будуць выконваць пастаўленыя перад імі задачы на функцыянальнай аснове. «Упершыню прэзідыум будзе збірацца не дзеля галасавання і таго, каб пачуць нейкія мэты, задачы, а кожны (з членаў Прэзідыума УНС. — **«Зв.»**), зыходзячы са сваіх прафесійных навыкаў, уменняў, вопыту, будзе курыраваць пэўны кірунак», — сказаў намеснік старшыні УНС.

Напрыклад, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Вадзім Богуш будзе курыраваць ад Прэзідыума УНС тэматыку, якая датычыцца адукацыі, маладзёжнай палітыкі, пераемнасці пакаленняў, дэлегат ад грамадзянскай супольнасці Надзея Ермакова — адпаведную тэматыку грамадзянскай супольнасці, захавання ў ёй згоды, а дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня профільнай камісіі Марына Ленчэўская — сферу заканадаўства, выканання законаў, праваых актаў, якія выдаюцца заканадаўчымі і выканаўчымі органамі. «Гэта не проста членства ў Прэзідыуме, а вельмі сур'ёзная, напружаная работа, якая курыруе ўсе кірункі дзейнасці УНС, гэта значыць, вызначэнне яго стратэгіі, пытанні, звязаныя з кансалідацыяй грамадства, непахіснасцю канстытуцыйнага ладу, пераемнасцю пакаленняў, грамадзянскай згодай», — адзначыў Аляксандр Косінец.

Што датычыцца Сакратарыята УНС, то Прэзідэнтам пастаўлена задача арганізаваць сістэму ўзаемадзеяння з дзяржорганамі, губернатарамі, мясцовымі органамі ўлады, суб'ектамі грамадзянскай супольнасці. «Сакратарыят УНС, у якім налічваецца ўсяго 10 чалавек, будзе таксама ажыццяўляць куратарства найважнейшых кірункаў рэгіянальнай палітыкі, ідэалогіі, права, пытанняў, звязаных з эканамічным развіццём нашай дзяржавы, а таксама будзе ажыццяўляць кантроль за ўсімі рашэннямі, што прымаюцца УНС», — растлумачыў намеснік старшыні УНС.

Яшчэ адна з прыярытэтных задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы, — сістэмная работа з дэлегатамі УНС па вертыкалі старшыня — намеснік — сакратарыят — дэлегаты УНС. Бо ў склад сходу ўваходзяць каля 1,2 тысячы дэлегатаў.

«Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу, каб кожны дэлегат УНС штодзень, кожную гадзіну ўдзельнічаў у яго рабоце (рабоце УНС. — **«Зв.»**), — звярнуў увагу Аляксандр Косінец. — Гэта не ранейшыя сходы, якія праводзіліся ад аднаго з'езда да другога. У далейшым будуць праводзіцца штогадовыя пасяджэнні (УНС. — **«Зв.»**), а прэзідыума — не радзей як адзін раз на паўгоддзе. Будуць абмяркоўвацца найважнейшыя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця, нацыянальнай бяспекі, жыцця людзей, будаўніцтва дзяржавы для народа. Для таго, каб мы разам сапраўды будавалі моцную, квітнеючую Беларусь. І ў гэтым будзе ўдзельнічаць кожны дэлегат УНС».

Улічваючы, што ў складзе УНС ёсць і члены ўрада, і парламентарыі, дэпутаты ўсіх узроўняў, і старшыні абл-, гар- і райвыканкамаў, і прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, і суддзі, яны будуць максімальна ўзаемадзейнічаць з усімі сацыяльнымі пластамі грамадства як на рэспубліканскім, так і на рэгіянальным узроўнях.

«Яны пойдуць у народ, у працоўныя калектывы, ва ўстановы і арганізацыі, будуць растлумачваць палітыку нашай дзяржавы і Усебеларускага народнага сходу, — адзначыў намеснік старшыні УНС. — Ім неабходна будзе мець пастаянны кантакт са сваімі падначаленымі, выбаршчыкамі і, зразумела, дакладваць аб праведзенай рабоце. Мы будзем кантраляваць гэтую работу ў абавязковым парадку — як яна наладжана, як ажыццяўляецца будаўніцтва дзяржавы для народа».

Аляксандр Косінец запэўніў, што выбудаваная работа будзе максімальна эфектыўнай: «Мы дойдзем да самага апошняга хутара, будзем бачыць, як жыве народ, вызначаць яго спадзяванні, ажыццяўляць клопат. Для таго, каб у нас была магутная, свабодная, суверэнная дзяржава».

На працягу тыдня сакратарыяту трэба падрыхтаваць і прадставіць на разгляд Прэзідэнту, Старшыні УНС, шэраг дакументаў, якія рэгулююць далейшую работу УНС і яго органаў.

Парламенцкі дзённік

# АСЭНСАВАЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ НА РЭЗУЛЬТАТ

## Якія задачы стаяць перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў пасля УНС

**У Палаце прадстаўнікоў пад кіраўніцтвам старшыні Ігара СЕРГЕЕНКІ прайшла рабочая нарада з дэпутатамі па пытаннях арганізацыі работы ў выбарчых акругах. На парадку дня — даручэнні кіраўніка дзяржавы, дадзеныя дэлегатам Усебеларускага народнага сходу, інфармацыйная работа з выбаршчыкамі па асвятленні рашэнняў, прынятых на УНС.**



Фота БелТА.

Гаворачы пра значэнне VII Усебеларускага народнага сходу, Ігар Сергеенка адзначыў: «У летапіс дзяржаўнага будаўніцтва ўпісана новая яркая старонка. Сёння наша задача як дэпутатаў і дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу (а кожны фактычна дзясяты дэлегат — дэпутат Палаты прадстаўнікоў) — гэта рэалізацыя даручэнняў кіраўніка дзяржавы і палажэнняў прынятых дакументаў».

«Прэзідэнтам дадзена настолькі глыбокая і комплексная ацэнка сітуацыі ў краіне і за яе межамі, што кожны тэзіс яго выступлення патрабуе самага сур'ёзнага асэнсавання. І не проста асэнсавання, а выхаду на адпаведныя дэпутацкія ініцыятывы, нацэленыя на канчатковы вынік, — адзначыў спікер. — Яшчэ раз неабходна нам усім самым уважлівым чынам прааналізаваць выступленні кіраўніка дзяржавы, прынятыя Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі і Ваенную дактрыну. Яны павінны легчы ў аснову нашай заканадаўчай, міжнароднай дзейнасці, дыялогу з насельніцтвам на доўгатэрміновую перспектыву».

«У найбліжэйшыя дні дэпутаты будуць працаваць у выбарчых акругах, і гэтыя дні трэба максімальна выкарыстоўваць у плане інфармацыйна-тлумачальнай работы. Дарэчы, неабходна своечасова інфармаваць выбаршчыкаў аб маючых адбыцца сустрэчах. Мяркую, што асноўны акцэнт неабходна зрабіць на наступных пытаннях, — сказаў Ігар Сергеенка. — Па-першае, растлумачыць, у чым заключаецца гістарычная роля УНС як найвышэйшага органа народаўладдзя, якія задачы сход будзе вырашаць, каб захаваць сацыяльна арыентаваную мадэль беларускай дзяржаўнасці».

Па-другое, абавязак дэпутатаў — данесці да кожнага, як важна сёння быць моцнымі, адзінымі, згуртаванымі ў адстойванні інтарэсаў краіны, зазначыў спікер. «Людзі павінны ведаць, якія існуюць рызыкі, выклікі і пагрозы, якім сёння неабходна актыўна супрацьстаяць, — падкрэсліў ён. — Па-трэцяе, нашы выбаршчыкі павінны разумець тыя пагрозы, якія нясуць у сабе дэструктыўная дзейнасць «пятай калоны», разнастайныя экстрэмісты і іх замежныя куратары, якія дзеля змены ўлады ў краіне гатовыя на ўсё, і супрацьстаяць ім можна толькі разам».

«Спробы расхістаць наша грамадства будуць працягвацца, асабліва напярэдадні будучай выбарчай кампаніі, — папярэдзіў Ігар Сергеенка. — Але мы павінны, як сказаў кіраўнік дзяржавы, захаваць Беларусь і яе народ, пажадана без вайны. Тым больш што ў Ваеннай дактрыне дакладна замацаваны мірны статус нашай дзяржавы і нападаць ні на каго мы не збіраемся».

Людзі павінны разумець, што яны не староннія назіральнікі, зазначыў спікер. «Сёння спакой у краіне, барацьба з пагрозамі тэрарызму і экстрэмізму залежаць ад кожнага з нас», — падкрэсліў ён.

«Таму заклік Прэзідэнта, які адносіўся да дэлегатаў УНС, быць пільнымі, інфармаваць уладу аб любых фактах, якія могуць дэстабілізаваць абстаноўку ў краіне, павінен успрымацца як фактар забеспячэння ўласнай бяспекі, бяспекі сваіх блізкіх», — дапоўніў Ігар Сергеенка.

Асаблівая ўвага — моладзі. «Неабходна актыўна даносіць да людзей тэзіс Прэзідэнта, што заходнія спецслужбы сёння глядзяць на нашых людзей, і асабліва на моладзь, як на вербавальны матэрыял. На інфармацыйна-псіхалагічныя аперацыі трацяцца вялікія сродкі», — сказаў Ігар Сергеенка.

Дзяржава, безумоўна, шмат робіць у супрацьстаянні такім планам, адзначыў спікер. «Але галоўнае — павінна быць аддача і рух насустрач і з боку нашых грамадзян, — падкрэсліў ён. — Сям'я, грамадзянская пазіцыя бацькоў, на якіх ляжыць прамы абавязак зберагчы моладзь ад уключэння ў супрацьпраўную дзейнасць».

«Акрамя інфармацыйна-тлумачальнай работы, нам таксама вельмі важна атрымаць зваротную сувязь ад насельніцтва. Адчуць гэту сувязь чарговы раз. Мы павінны стаць, як сказаў Прэзідэнт, барометрам грамадскіх адносін, — адзначыў Ігар Сергеенка. — У ходзе сустрэч з працоўнымі калектывамі, выбаршчыкамі неабходна самым адказным чынам падысці да вывучэння адзнак людзей аб сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, грамадска-палітычнай, а таксама аб праблемных пытаннях, якія найбольш хвалююць грамадзян».

Гэта павінен быць своеасаблівы зрэз грамадскай думкі, але ўжо вачыма дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дадаў спікер. «Нагадваю, што па прыездзе з акругі кожны дэпутат павінен будзе прадставіць адпаведную інфармацыю. Мы больш дэталёва потым спынімся, па якіх кірунках. Атрыманая інфармацыя, упэўнены, будзе служыць адпраўным пунктам для аналітычнай дзейнасці непасрэдна ў Палаце прадстаўнікоў, для выкарыстання ў заканатворчасці, калі мы ўбачым, што ў гэтым ёсць рэальная неабходнасць сёння або ў далейшым, а таксама для інфармавання кіраўніка дзяржавы», — падкрэсліў ён.

«Яшчэ адна важная задача ў ходзе сустрэч з выбаршчыкамі — гэта інфармаванне аб нашай заканатворчай дзейнасці. Вы павінны валодаць інфармацыяй па законапраектах, якія знаходзяцца ў Палаце на гэты момант і якія могуць выклікаць найбольшы рэзананс і цікавасць у грамадзян», — адзначыў Ігар Сергеенка.

***Паводле БелТА.***

Мы помнім!

# Дарогамі вогненных вёсак




**Сумесны праект — аўтапрабег «Сёстры Хатыні», прымеркаваны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — рэалізуюць РГА «Патрыёты Беларусі» і тэлеканал АНТ. Місія ўдзельнікаў экспедыцыі, маршруты якой праходзяць па ўсёй краіне, — аддаць даніну памяці тым, хто стаў нявіннай ахвярай нацысцкіх карнікаў і іх памагатых.**

Рэспубліканская акцыя стартавала ў Мінску 11 красавіка і працягнецца да 30 чэрвеня ўключна. Удзельнікі аўтапрабегу ўжо праехалі па населеных пунктах, якія назаўсёды засталіся толькі ў чалавечай памяці, Брэсцкай, Мінскай і Віцебскай абласцей. Паўночны рэгіён актывісты наведалі напрыканцы красавіка, адзначыўшы на сваім маршруце Полацкі, Віцебскі і Расонскі раёны.

На карце 80-дзённага маршруту ў тысячу кіламетраў — 37 малавядомых месцаў Беларусі. У месцах памяці і смутку ўдзельнікі экспедыцыі праводзяць мітынгі-рэквіемы, устанаўліваюць таблічкі з QR-кодам, на якім змяшчаецца інфармацыя аб аб'екце, займаюцца добраўпарадкаваннем. У памяць аб спаленых разам з жыхарамі вёсках у гады Вялікай Айчыннай вайны арганізаваны аўтамабільныя эстафеты з перадачай лампад з агнём з Хатыні. Такія акцыі гуртуюць жыхароў краіны, перакананы **старшыня РГА «Патрыёты Беларусі» Мікалай ЗАРУБІЦКІ**:

— Праект «Сёстры Хатыні» яшчэ раз нагадвае пра злачынствы, учыненыя фашыстамі на нашай зямлі, і пра цану, якой дасталася нам незалежнасць. Па дарозе да калоны далучаюцца неабыякавыя людзі. Ёсць і тыя, хто ведае наш маршрут, і проста выходзяць павітаць.

Падчас прыбыцця ўдзельнікаў акцыі ў Віцебскую вобласць мітынгрэквіем прайшоў у вёсцы Царова Полацкага раёна. У красавіку 1944 года акупанты спалілі тут усе дамы разам з жыхарамі. Пасёлак знік з твару зямлі як населены пункт, але назаўжды застанецца ў народнай памяці. Толькі на Полаччыне фашысцкія захопнікі знішчылі больш як 400 населеных пунктаў, 18 вёсак так і не змаглі адрадзіцца пасля вайны.

Вёску Веле Расонскага раёна фашысты знішчылі ў лютым 1943 года. На вяршыні брацкай магілы ўстаноўлены помнік, а каля падножжа на гранітных плітах выгравіравана 74 імені і прозвішчы загінулых дзяцей, маці, старых. У выніку карных аперацый на Расоншчыне акупанты знішчылі каля дзвюх тысяч мірных жыхароў, спалілі 199 вёсак, больш чым сто так і не адноўлена. Яны, у тым ліку і Веле, увекавечаны на мемарыяльным комплексе «Хатынь».

«У гісторыі Расоншчыны вайна пакінула страшны крывавы след, асабліва пакуты выпалі на долю мірнага насельніцтва, жыццё якога праходзіла ва ўмовах акупацыйнага рэжыму. Гэта велізарны боль. І важна захаваць памяць, перадаць яе наступным пакаленням, каб больш ніколі не паўтарылася тое, што перажылі нашы родныя. Няма ніводнай сям'і, якую не закранула б вайна», — адзначыў **старшыня Расонскага райвыканкама Уладзімір БЫКАЎ**.

Сумная доля спасцігла і вёску Лычнева Віцебскага раёна: у ліпені 1942 года нямецка-фашысцкія захопнікі сцерлі яе з твару зямлі. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны тут жылі 185 чалавек. Улетку 1942 года карнікі забілі 144 жыхары і агнём цалкам знішчылі населены пункт. Галоўным фактарам акта бесчалавечнасці паслужыла тое, што вёска знаходзілася на тэрыторыі знакамітай Суражскай партызанскай зоны, якую ў немцаў не атрымлівалася захапіць. У 1988 годзе тут устанавілі мемарыяльны знак у памяць аб знішчаных жыхарах вёскі Лычнева. Яе ў ліку іншых можна ўбачыць у мемарыяльным комплексе «Хатынь». Цяпер на гэтым месцы ёсць шыльда з QR-кодам.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота ТК «Віцебскі раён. Афіцыйна».**

Блізкая ўлада

**ГРАФІК**
**прыёму грамадзян кіраўніцтвам Палаты прадстаўнікоў і Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

| | Дні прыёму | Час прыёму |
|---|---|---|
| **Кіраўніцтва Палаты прадстаўнікоў** | | |
| Старшыня Палаты прадстаўнікоў Сергеенка І. П. | 1-ы панядзелак | 8.00 — 13.00 |
| Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Іпатаў В. Д. | 4-ы панядзелак | 8.00 — 13.00 |
| **Кіраўніцтва пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў** | | |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Ленчэўская М. А. | 3-і чацвер | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Лепяшко Г. У. | 2-і чацвер | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Семяняка В. М. | 4-я пятніца | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Маркевіч І. С. | 2-і аўторак | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Марзалюк І. А. | 1-ы чацвер | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Бузін М. Я. | 3-і панядзелак | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Рачкоў С. А. | 4-я серада | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Чарняўская Ж. М. | 1-я серада | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Панасюк В. В. | 1-ы аўторак | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Нікалайкін В. П. | 4-ы аўторак | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Касцевіч І. А. | 4-ы чацвер | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Малашка В. А. | 2-і панядзелак | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, гандлі і будаўніцтве Наркевіч Ю. І. | 2-я серада | 8.00 — 13.00 |
| Старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Панфілаў Ю. А. | 1-я пятніца | 8.00 — 13.00 |
| **Кіраўніцтва Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў** | | |
| Начальнік Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Наумовіч А. М. | 3-я серада | 8.00 — 13.00 |
| Намеснік начальнік Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Кузураў Д. У. | 2-я серада | 8.00 — 13.00 |
| Намеснік начальніка Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Лапша І. М. | 3-я пятніца | 8.00 — 13.00 |

**Прыём будзе ажыццяўляцца па папярэднім запісе. Запісацца можна ў рабочыя дні з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 18.00 па тэлефонах: (017) 222 62 52 і (017) 222 63 58**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокія спачуванні намесніку старшыні Усебеларускага народнага сходу Аляксандру Мікалаевічу КОСІНЦУ ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЗША затрымалі больш за 700 чалавек з-за прапалесцінскіх пратэстаў студэнтаў



Студэнцкія акцыі ў падтрымку Палесціны прывялі да затрымання ў ЗША больш за 700 чалавек. Аб гэтым паведаміла газета The New York Times. Адзначаецца, што «новую хвалю студэнцкай актыўнасці» і дэманстрацый пратэсту супраць ваенных дзеянняў Ізраіля ў сектары Газа справакавала затрыманне паліцыяй 108 чалавек пры разгоне 18 красавіка маніфестантаў, якія арганізавалі палатачны лагер на тэрыторыі Калумбійскага ўніверсітэта ў Нью-Ёрку. Па звестках выдання, 118 чалавек былі затрыманы праваахоўнікамі падчас ліквідацыі палатачнага лагера на тэрыторыі Каледжа Эмерсан у Бостане (штат Масачусетс), 102 — у Паўночна-Усходнім універсітэце, які таксама размешчаны ў Бостане, 93 — ва Універсітэце Паўднёвай Каліфорніі. Дзясяткі студэнтаў затрыманы ў Тэхаскім універсітэце, Індыянскім універсітэце ў Блумінгтоне, Універсітэце Эмары ў Атланце (штат Джорджыя) і Універсітэце штата Арызона. Затрыманні закранулі таксама Прынстанскі, Ельскі, Нью-Ёркскі ўніверсітэты, Універсітэт Мінесоты і Універсітэт штата Агаё.

### Партугалія адмовілася выплачваць рэпарацыі за каланіяльнае мінулае

Урад Партугаліі адмовіўся ініцыіраваць працэс выплат кампенсацый за каланіяльнае мінулае і рабства, нягледзячы на заяву прэзідэнта. Пра гэта паведаміла агенцтва Reuters. У заяве, якую прыводзіць агенцтва, адзначаецца, што няма праграмы канкрэтных дзеянняў па выплаце кампенсацый. Падкрэсліваецца, што ўрад хоча «паглыбляць узаемаадносіны, паважаць гістарычную праўду і ўсё больш інтэнсіўнае і цеснае супрацоўніцтва, заснаванае на прымірэнні брацкіх народаў». Як вядома, працэс масавага вызвалення народаў Афрыкі ад каланіялізму пачаўся ў 60-х гадах мінулага стагоддзя. У склад каланіяльнай імперыі Партугаліі ў розны час уваходзілі Ангола, Бразілія, Усходні Цімор, Каба-Вэрдэ і Мазамбік, а таксама некаторыя часткі Індыі.

### Італьянскі вучоны знайшоў магілу Платона



Грацыяна Ранак'я, папіролаг з Пізанскага ўніверсітэта, паведаміў, што знайшоў дакладнае месца пахавання Платона, расшыфраваўшы папірусы, знойдзеныя амаль 300 гадоў таму ў Геркулануме каля Неапаля, паведаміла BBC. Па меркаванні даследчыкаў, знаходкі паказваюць на тое, што Платон быў пахаваны ў Акадэміі ў Афінах, у садзе побач з «Храмам муз». Гэта ўдалося ўстанавіць дзякуючы новай інтэрпрэтацыі папірусаў, напісаных Філадэмам з эпікурэйскай школы, у якіх падрабязна апісваецца гісторыя акадэміі. Платон, які памёр каля 347 года да н. э., лічыцца адным з найвялікшых грэчаскіх філосафаў. Навукоўцы спрабуюць расшыфраваць скруткі не адно дзесяцігоддзе. Цяпер на дапамогу ім прыйшлі тэхналогіі штучнага інтэлекту. У выніку Ранак'я і яго каманда здолелі прачытаць каля 1000 слоў — прыкладна траціну ўсяго тэксту — і мяркуюць, што цалкам расшыфруюць папірус да 2026 года.

# ВЯРНУЦЬ ГЕРОЯЎ З ЗАБЫЦЦЯ

## Якія пытанні абмяркоўваліся на рэспубліканскім семінары з кіраўнікамі грамадскіх пошукавых аб'яднанняў

**У семінары ўзялі ўдзел кіраўнікі грамадскіх пошукавых аб'яднанняў (клубаў, груп) нашай краіны, прадстаўнікі Міністэрства абароны, Генеральнай пракуратуры, абласных выканаўчых камітэтаў і горада Мінска, адказныя за арганізацыю работы па ўшанаванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн, супрацоўнікі абласных ваенных камісарыятаў і сталіцы, камандаванне 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна. Удзельнікі мерапрыемства абмеркавалі канкрэтныя дзеянні па кансалідацыі намаганняў дзяржаўных органаў, органаў выканаўчай улады і пошукавікаў грамадскіх арганізацый у рабоце па ўшанаванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн, вызначылі найбліжэйшыя перспектывы развіцця пошукавага руху ў Беларусі, асноўныя кірункі і ўмовы ўзаемадзеяння грамадскіх пошукавых аб'яднанняў (клубаў, груп) з дзяржаўнымі арганізацыямі.**

### «Усенародны подзвіг — неад'емная частка нацыянальнай ідэі»

Як звярнуў увагу **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Леанід КАСІНСКІ**, актуальнасць сустрэчы, якая ўпершыню праводзіцца ў такім фармаце, дыктуе сам час. «Цалкам відавочна, што сёння гісторыя стала закладніцай вялікай палітыкі, дзе барацьба за гістарычную праўду, па сутнасці, з'яўляецца барацьбой за будучыню ўсяго свету, — падкрэсліў генерал-маёр. — Мы бачым, як у многіх заходніх краінах фальсіфікуецца гістарычная праўда аб падзеях Другой сусветнай вайны, масава разбураюцца помнікі савецкім воінам-вызваліцелям, героямі абвяшчаюцца каты і забойцы. Усё выглядае так, як быццам не было ніколі прызнаных сусветнай супольнасцю вынікаў Другой сусветнай вайны. У краінах Балтыі, Украіне маршыруюць малойчыкі пад сцягамі дывізій СС, уладкоўваюцца факельныя шэсці, мацёрыя нацыяналісты без суда і следства спраўляюцца з тымі, хто не дае знесці помнікі воінам Чырвонай Арміі. А тыя, хто шануе памяць аб Вялікай Перамозе, з'яўляюцца ледзь не ворагамі нацыі».

Па словах Леаніда Касінскага, беспрэцэдэнтныя інфармацыйныя атакі і розныя фальсіфікацыі калектыўнага Захаду накіраваны таксама на разбурэнне гістарычнай памяці беларускіх грамадзян і наданне забыццю злачынстваў, учыненых нацыстамі і іх памагатымі ў дачыненні да беларускага народа. «Падзеі ва Украіне наглядна дэманструюць, як скажэнне і перагляд гістарычнай праўды ў адносінах да падзей Вялікай Айчыннай вайны літаральна за некалькі дзесяцігоддзяў прывялі да татальнай нацыфікацыі ўкраінскай дзяржавы і фактычнай страты незалежнасці Украіны, — тлумачыць ён. — У гэтых умовах праўда аб злачынствах фашызму служыць сур'ёзнай перасцярогай чалавецтву, а ўвекавечанне памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн набывае асаблівае маральнае значэнне. Для беларусаў, якія страцілі ў гады Вялікай Айчыннай вайны кожнага трэцяга, усенародны подзвіг з'яўляецца неад'емнай часткай нацыянальнай ідэі і падмуркам нашай дзяржаўнасці і грамадзянскай згоды».

Невыпадкова ў нашай краіне рэалізоўваецца палітыка, накіраваная на захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным мінулым беларускага народа.

Важная роля ў гэтым працэсе адносіцца да дзейнасці ўпраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн Узброеных Сіл, 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна, прадстаўнікоў грамадскіх пошукавых аб'яднанняў. У тым ліку дзякуючы і апошнім наша гістарычная спадчына папаўняецца новымі артэфактамі, пошукавымі знаходкамі, якія з'яўляюцца носьбітамі праўды аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

Аб маштабах гэтай работы сведчаць наступныя лічбы. У мінулым годзе ў правядзенні палявых пошукавых работ узялі ўдзел 167 пошукавікаў з дзесяці грамадскіх аб'яднанняў, атрадаў, клубаў. Раскопкі праведзены на больш як 60 пошукавых аб'ектах, падняты астанкі 481 ваеннаслужачага Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, аднаўлены звесткі аб 35 з іх.

### У плане палявых пошукавых работ — 123 аб'екты

На бягучы пошукавы сезон, які пачаўся 26 сакавіка, — не менш амбіцыйныя задачы. **Начальнік упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Сяргей КОРНЕЎ** лічыць сімвалічным, што ён праходзіць пад эгідай 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Сёлета, улічваючы знакавую дату для нашай рэспублікі, ваенным ведамствам сумесна з органамі мясцовай выканаўчай і распарадчай улады будзе праходзіць рэспубліканская патрыятычная пошукавая акцыя «Беларусь памятае: эстафета памяці», дзе ў пэўны прамежак часу паэтапна сумесна з пошукавікамі грамадскіх аб'яднанняў будуць праведзены работы ў месцах бітваў, баёў па ўстанаўленні няўлічаных воінскіх пахаванняў», — удакладніў ён.

Усяго, па словах Сяргея Корнева, у рамках палявых пошукавых работ, якія пройдуць на тэрыторыі ўсіх абласцей, на месцах правядзення баёў запланавана адпрацаваць 99 аб'ектаў, на 24 аб'ектах палявыя пошукавыя работы будуць ажыццяўляцца ў межах расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны сумесна з Генеральнай пракуратурай.

Як расказаў **кіраўнік следчай групы Генеральнай пракуратуры па расследаванні крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа — начальнік упраўлення па наглядзе за расследаваннем асабліва важных крымінальных спраў Валерый ТАЛКАЧОЎ**, Генеральная пракуратура працягвае расследаванне крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа. «Калі казаць пра найбліжэйшыя планы, то органамі пракуратуры плануецца накіраванне шэрагу крымінальных спраў у суд у дачыненні да памагатых нацысцкіх злачынцаў па аналогіі з крымінальнай справай у дачыненні да Катрука, якая сёлета была разгледжана ў Вярхоўным Судзе, быў вынесены абвінаваўчы прысуд, — канкрэтызаваў ён. — Таксама працягваецца работа сумесна з Міністэрствам абароны па ўстанаўленні, пошуку новых, раней невядомых месцаў знішчэння і масавага пахавання мірнага насельніцтва, ваеннапалонных. Гэта работа прыносіць свае вынікі. Толькі ў мінулым годзе намі праведзена 40 такіх пошукавых мерапрыемстваў у розных месцах рэспублікі, сёлета плануем прыкладна столькі ж».

Валерый Талкачоў расказаў, што працягваюцца пошукавыя мерапрыемствы і ва ўрочышчы Уручча пад Мінскам. «Мы ўжо працуем там трэці год і пастаянна знаходзім новыя пахаванні мірнага насельніцтва і ваеннапалонных, — адзначыў начальнік упраўлення. — Дзякуючы рабоце пракурораў, 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны быў знойдзены жэтон чырвонаармейца. Мы прызначылі адпаведную экспертызу. Па выніках экспертных даследаванняў быў цалкам ідэнтыфікаваны надпіс медальёна і, адпаведна, усталяваны чырвонаармеец. Такім чынам, з забыцця вернута яшчэ адно імя — героя, чырвонаармейца, які трапіў у палон і быў такім жахлівым, варварскім спосабам знішчаны так, як і іншыя нашы ваеннапалонныя. Работа працягваецца. Думаю, што гэта не апошні салдацкі медальён».



Фота БелТА.

### Маральны абавязак

У апошнія гады дзейнасць па ўвекавечанні памяці ў нашай краіне істотна актывізавалася. У сувязі з гэтым становяцца актуальным новыя праблемныя пытанні, якія, па меркаванні Міністэрства абароны, патрабуюць комплекснага вывучэння і ўзгодненых рашэнняў. Адно з іх датычыцца дазволу членам грамадскіх пошукавых аб'яднанняў праводзіць разведку на мясцовасці і самастойна ажыццяўляць палявыя пошукавыя работы. У сувязі з гэтым у дзяржаўных органаў ёсць аб'ектыўныя засцярогі. Па-першае, пашырэнне правоў пошукавых грамадскіх аб'яднанняў можа актывізаваць тых, хто новыя магчымасці будзе выкарыстоўваць у карыслівых мэтах. Па-другое, ажыццяўляць пошукавыя работы без падрыхтаваных ваеннаслужачых яшчэ і небяспечна: месцы баёў дагэтуль захоўваюць зброю і боепрыпасы. Таму ці варта рызыкаваць жыццём і здароўем людзей, якія на добраахвотных пачатках ажыццяўляюць палявыя пошукавыя работы, гэтым самым выконваючы ганаровую місію па выяўленні зніклых без вестак і вяртанні іх імён?

Як расказаў **камандзір пошукавага атрада «Эстафета памяці» (Светлагорскі раён) Раман ЦЯРЭШЧАНКА**, за пяць гадоў, колькі існуе атрад, намаганнямі пошукавікаў падняты 851 баец Чырвонай Арміі. «У асноўным, працуем у Светлагорскім і Акцябрскім раёнах, — удакладніў ён. — За гэты час паднялі звыш 20 медальёнаў, ордэны, медалі. Устанавілі 18 імён. Таксама вядзём работу па ўстанаўленні імён, якія дагэтуль не былі ўвекавечаны на тэрыторыі раёна. Такім чынам, працуем па розных кірунках. Праводзім урокі мужнасці ва ўсіх школах раёна, дзе арганізаваны музеі, пакоі баявой славы. Пры Парыцкай сярэдняй школе створаны дзіцяча-маладзёжны пошукавы атрад. Дзецям гэта цікава. Яны ўдзельнічаюць ва ўсіх перапахаваннях».

У пошукавым атрадзе «Эстафета памяці» ўсяго сем чалавек. У кожнага з яго членаў нехта са сваякоў загінуў на фронце. У кіраўніка атрада з Вялікай Айчыннай вайны не вярнуліся два яго дзяды. «Пошукавая работа — наш маральны абавязак перад памяццю сваіх блізкіх, іншых, хто загінуў, змагаючыся за Радзіму. Хто, калі не мы?!» — падкрэсліў Раман Цярэшчанка.

**Кіраўнік пошукавай групы «Бацькаўшчына» Аляксандр ДУДАРОНАК** расказаў, што грамадскае аб'яднанне ажыццяўляе пошукавую дзейнасць з лютага 1992 года.

За гэты час зроблена немала: падымаюцца астанкі байцоў, устанаўліваюцца іх імёны. Гэтаму папярэднічае вялікая работа з архіўнымі дакументамі, фатаздымкамі. Напрыклад, дзякуючы нямецкім фатаграфіям пошукавікі з дакладнасцю ўстанаўліваюць месцы пахаванняў байцоў Чырвонай Арміі.

«Мы выкупілі шэраг фотаздымкаў, атрымалі іх копіі, выйшлі на гэтыя месцы, застаецца толькі з пошукавым батальёнам пераканацца, што там ляжаць нашы хлопцы, зафіксаваныя на нямецкіх фотаздымках, — заўважыў Аляксандр Дударонак і агучыў праблему, якая хвалюе пошукавікаў: — На жаль, каштоўныя сёння фотаздымкі ідуць міма тых структур, дзе павінны знаходзіцца — у архівах, музеях, а не ў прыватных калекцыях, недаступных тым, хто зацікаўлены ў захаванні гістарычнай памяці. Дзе ёсць магчымасць, мы выхопліваем гэтыя фотаздымкі. Дзе няма — імкнёмся атрымаць хаця б копію. Гэта таксама нітачка, за якую можна разматаць клубок гісторыі той ці іншай падзеі, звязанай з нашай Беларуссю».

У завяршэнні семінара прадстаўнікі Узброеных Сіл, Генеральнай пракуратуры, Міністэрства юстыцыі, Нацыянальнага архіва і пошукавых грамадскіх аб'яднанняў сталі ўдзельнікамі цырымоніі ўрачыстага старту рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае: эстафета памяці».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ГОДНАЯ ЗМЕНА

## Карэспандэнты «Звязды» пабачылі, як суворАўцы рыхтуюцца да святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

**Жыхароў і гасцей сталіцы чакае падарунак: з нагоды юбілейнай даты плануецца правесці парад войскаў Мінскага гарнізона. Ва ўрачыстым маршы, які нікога не пакідае абыякавым, возьмуць удзел і выхаванцы Мінскага суворАўскага ваеннага вучылішча. Традыцыйна самыя юныя ўдзельнікі парада адкрыюць гэтае відовішчнае дзейства — у прыгожай чорнай форме, з пунсовымі пагонамі і амаль генеральскімі лампасамі, б'ючы ў барабаны, яны зададуць урачысты тон усяму шэсцю, засведчыўшы, што ў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама сённяшніх абаронцаў Айчыны расце годная змена.**

Найперш мінскія суворАўцы пройдуць урачыстым маршам у Ніжнім Ноўгарадзе і Кемераве — па запрашэнні сваіх расійскіх сяброў яны возьмуць удзел у ваенных парадах, прымеркаваных да Дня Перамогі.

Да гэтых важных падзей выхаванцы Мінскага суворАўскага ваеннага вучылішча сталі рыхтавацца загадзя. У лістападзе пачалі асвойваць барабаны, а ў сакавіку, як толькі растаў снег, выйшлі з інструментамі на пляц. У суворАўцаў і без таго насычаны распарадак, цяпер жа ў іх — увогуле гарачая пара. Чатыры разы на тыдзень, раніцай і вечарам, хлопцы трэніруюцца, каб у адказны дзень быць, як заўжды, на вышыні.

### МАРА ДЗЯЦІНСТВА

Раніцай хлопцы адточваюць страявую падрыхтоўку (каб не перашкаджаць адпачываць жыхарам шматпавярховікаў, якія знаходзяцца побач з вучылішчам, трэніруюцца без барабанаў). Пасля абеду — усё тое ж самае, але з музычным інструментам у руках.

**Суворавец 2-й роты 1-га ўзвода 3 курса Павел ГЕРАСІМОВІЧ** расказвае, што біць у барабан навучыўся ў першы ж дзень трэніровак. «А вось падбіраць крок пад барабан — даволі складана, не адразу атрымліваецца, — дзеліцца ён. — Спачатку мы проста асвойвалі музычны інструмент, затым вучыліся страявой хадзьбе з барабанам у руках. Выходзім на той узровень, на якім варта прымаць удзел у парадзе. Падчас трэніровак імкнуся выкладвацца напоўніцу, каб у выніку справіцца з пастаўленай задачай на «выдатна».

Павел вельмі ганарыцца, што будзе браць удзел у парадзе з нагоды святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ён марыў аб гэтым з самага дзяцінства. Дарэчы, менавіта гэтая падзея і паўплывала на яго рашэнне паступіць у Мінскае суворАўскае ваеннае вучылішча. Гледзячы на ўдзельнікаў парада, ён бачыў сябе ў іх шэрагах: спачатку — у якасці суворАўца, затым — ваеннаслужачага. Да здзяйснення першай мары засталося зусім крыху.

Працягнуць афіцэрскую дынастыю для Паўла Герасімовіча — справа гонару. Яго дзядуля служыў у 2-й інжынернай брыгадзе, выйшаў у адстаўку ў званні падпалкоўніка. «Мы з ім даволі шмат часу праводзілі ў дзяцінстве, безумоўна, ён таксама паўплываў на мой прафесійны выбар», — заўважае малады чалавек.

### САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ЗЛАДЖАНАСЦЬ

Такі шчыльны графік трэніровак ніяк не адбіваецца на вучэбным працэсе суворАўцаў. Заняткі ідуць згодна з планам. А вось асабістага часу амаль не засталося. Аднак выхаванцы вучылішча не скардзяцца: яны разумеюць важнасць падзеі, якая чакае іх наперадзе, а таму імкнуцца паспяхова справіцца з пастаўленай задачай.

— Самае галоўнае, каб у хлопцаў было жаданне і крыху слыху: каб кожны разумеў, у які момант і якой рукой патрэбна ўдарыць у барабан, — адзначае **старшы выкладчык ваенных дысцыплін, камандзір 2-й роты суворАўцаў маёр Яўген КІШКО.** — Што датычыцца страявой вывучкі, для іх гэта не новае. Пачынаючы з першага курса, суворАўцы рэгулярна адточваюць страявое майстэрства. Яны ведаюць, што такое страявы крок, разумеюць інтэрвал дыстанцыі, які трэба вытрымліваць пры праходжанні. Вядома, ёсць свая спецыфіка: яны будуць ісці з барабанамі. Калі ўсе астатнія ідуць пляччо да пляча, то суворАўцы — з пэўным інтэрвалам дыстанцыі, які неабходна вытрымліваць у працэсе руху.

Яўген Кішко рыхтуе суворАўцаў да парада ўпершыню. Нягледзячы на гэта, уласным досведам падзяліцца можа: будучы навучэнцам Мінскага суворАўскага ваеннага вучылішча, ваеннаслужачы меў гонар удзельнічаць у парадзе. Ён дагэтуль памятае свае ўражанні. «Такое не забываецца, — звяртае ўвагу Яўген, кажучы аб удзеле ў парадзе. — Гэта неверагодныя пачуцці, калі ты ідзеш, а на цябе скіраваны погляды тысяч людзей, якія сабраліся на трыбунах, глядзяць тэлебачанне. Адкрываючы парад, ты з'яўляешся ледзь не галоўнай зоркай гэтага найважнейшага мерапрыемства».

Яўген Кішко падкрэслівае: падрыхтоўка ідзе на найвышэйшым узроўні, ніякіх праблем не ўзнікае. Асаблівая ўвага на даным этапе ўдзяляецца трэніроўцы стойкасці. Паколькі афіцэр не па чутках ведае, што такое быць у парадным страі, дзеліцца са сваімі падапечнымі не толькі майстэрствам, а і, як прынята сёння казаць, лайфхакамі. «З-за спякотнага надвор'я (форма ў іх чорная) непасрэдна ў дзень парада хлопцы могуць адчуць сябе дрэнна, — канстатуе старшы выкладчык ваенных дысцыплін. — На крайні выпадак у пальчатках кожнага суворАўца знаходзіцца вата з нашатырОм — каб была магчымасць прывесці сябе ў парадак. Улічваем і псіхалагічны складнік: справіцца з хваляваннем таксама варта ўмець. Узгадваю, якія ў свой час настаўленні давалі мне. Паколькі трэба будзе праходзіць немалую адлегласць, кажу ім, дзе трэба больш напружыцца, а дзе — паберагчы сілы, энергію. Як правіла, хлопцы стойка пераносяць усе цяжкасці. За гады, праведзеныя ў вучылішчы, у іх выпрацоўваецца імунітэт. Аднак у выпадку форс-мажорнай сітуацыі, калі камусьці неабходна будзе сысці з дыстанцыі, ёсць хлопцы, якія заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу і выканаць дзяржаўную задачу».

Размова ідзе пра запасных. У суворАўскую парадную каробку ўваходзіць 80 выхаванцаў. У рэпетыцыі ж удзельнічаюць 92 чалавекі — з запасам, каб у выпадку форс-мажорнай сітуацыі было на каго разлічваць. Дагэтуль няма стапрацэнтнага разумення, хто з суворАўцаў будзе асноўным, а хто запасным. Акрамя таго, у працэсе падрыхтоўкі трэнер бачыць, у каго атрымліваецца лепш, а хто не дацягвае. Цяпер жа, па словах Яўгена Кішко, усе суворАўцы выкладваюцца на сто працэнтаў і паказваюць той вынік, які ад іх патрабуецца.

— Самае галоўнае ў паспяховым праходжанні на парадзе — агульная зладжанасць, — лічыць ён. — Калі няма зладжанасці, то ўсе намаганні будуць дарэмнымі. Тут не столькі важная індывідуальная падрыхтоўка, колькі работа ў камандзе: ад яе шмат што залежыць. Той, хто стаіць справа і злева ад цябе, іграе немалаважную ролю ў канчатковым поспеху.

### ГАНАРОВА І АДКАЗНА

Для кожнага з выхаванцаў Мінскага суворАўскага ваеннага вучылішча — гонар удзельнічаць у парадзе з нагоды 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З самых ранніх гадоў **суворавец 2-й роты 3-га ўзвода 3 курса Іван ЛАТЫШЭВІЧ** хадзіў з бацькамі на парады і марыў быць у шэрагах суворАўцаў.

«З самага дзяцінства хачу насіць пагоны, быць падобным да сваіх бацькоў, — прызнаецца ён. — Мой бацька — палкоўнік, з'яўляўся начальнікам ваеннай кафедры БДУ, цяпер у адстаўцы. Маці — прапаршчык, старшая медсястра прыёмнага аддзялення Галоўнага ваеннага медыцынскага клінічнага цэнтра № 432 Узброеных Сіл. Вельмі ганаруся імі, таму падвесці іх проста не маю права». Разам з таварышамі Іван будзе прадстаўляць нашу краіну на парадзе ў Ніжнім Ноўгарадзе.

У Расійскую Федэрацыю паедзе каля 60 мінскіх суворАўцаў: 48 з іх будуць удзельнічаць у парадзе з нагоды Дня Перамогі ў Ніжнім Ноўгарадзе, каля дзесяці — у Кемераве. Нельга сказаць, што ў Расію едуць самыя лепшыя з найлепшых: усе юнакі добра падрыхтаваныя і матываваныя. Справа ў тым, што ў гэты перыяд у суворАўцаў, якія вучацца ў спартыўнай роце, запланаваны спаборніцтвы па грэка-рымскай барацьбе.

**Віцэ-сяржант 2-й роты 4-га ўзвода 3 курса Іван НАВІЦКІ,** які акурат вучыцца ў спартыўнай роце, прызнаецца, што таксама хацеў прадстаўляць сваю краіну на парадзе ў Расіі, але наперадзе — важныя спартыўныя старты, да якіх ён ішоў не адзін год. Затое яму пашчасціла прадстаўляць Мінскае суворАўскае ваеннае вучылішча на парадзе ў Мінску.

«Каб удзельнічаць у парадзе, патрэбна быць стойкім, вынослівым, моцным, — кажа юнак. — Гэта камандная работа. Выконваць у страі сінхронна элементы няпроста, але гэта напрацоўваецца. Невыпадкова падрыхтоўка да парада займае шмат часу, але ўсё паспяваем: і рэпеціраваць, і да заняткаў рыхтавацца, і спортам займацца».

Іван прызнаецца: яму вельмі падабаецца вучыцца ў суворАўскім вучылішчы. «У такія юныя гады ў мяне ёсць таварышы, якія могуць у любы момант прыйсці на дапамогу, падтрымаць у складаную хвіліну», — кажа малады чалавек. Суворавец родам з Талачына, яго бацька служыць у Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях і з'яўляецца для сына прыкладам. Іван марыць быць падобным да бацькі, толькі служыць хоча ва Узброеных Сілах.

**Суворавец 2-й роты 2-га ўзвода 3 курса Аляксей ШУРБАК** плануе паступаць на факультэт ваеннай разведкі Ваеннай акадэміі і служыць у Сілах спецыяльных аперацый. Прызнаецца, што ніколькі не шкадуе, што паступіў сюды. А пачалося ўсё з таго, што ў 3-4 класах трапіў на Дзень адкрытых дзвярэй у Мінскае суворАўскае ваеннае вучылішча, дзе яму вельмі спадабалася.

«Гледзячы на сваіх равеснікаў, якія вучацца ў звычайных школах і нават гімназіях, з упэўненасцю магу сказаць, што ўзровень падрыхтоўкі ў Мінскім суворАўскім ваенным вучылішчы значна вышэйшы, — заўважае юнак. — Акрамя таго, нельга ні з чым параўнаць кадэцкае братэрства: тут мы знайшлі сяброў на ўсё жыццё. Шчаслівы, што выпаў гонар прымаць удзел у парадзе. Нам пашанцавала. Цяпер прыкладаем усе намаганні, каб у далейшым паказаць, чаго мы вартыя».

Па словах Аляксея, падрыхтоўка займае нямала часу, бывае няпроста. «Стомленасць хутка праходзіць, калі разумееш, што на нас будуць глядзець Прэзідэнт, вышэйшыя службовыя асобы, будуць накіраваны погляды гледачоў, камер, і, вядома, на парад прыйдуць нашы родныя, таму мы не маем права іх падвесці», — перакананы хлопец.

Нягледзячы на яшчэ зусім юны ўзрост, суворАўцы цудоўна разумеюць значымасць падзеі, у якой будуць браць удзел. А яшчэ яны ведаюць, што адкрываць парад войск Мінскага гарнізона — гэта не толькі ганарова, а і адказна. Менавіта суворАўцы задаюць тон усяму ўрачыстаму маршу. Таму прыкладуць максімум намаганняў, каб глядач не толькі атрымаў задавальненне ад убачанага, а і ў каторы раз адчуў гонар за сваю краіну, дзе расце годная змена.

**Вераніка КАНЮТА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## Информация о ОАО «Минский домостроительный комбинат» и его деятельности за 2023 г.

**Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %):**

| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Республиканская | - | - |
| Коммунальная всего: | 109852753 | 99,7576 |
| В том числе: | Х | Х |
| областная | - | - |
| районная | - | - |
| городская | 109852753 | 99,7576 |

**Информация о дивидендах и акций:**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 3258 | 3214 |
| В том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| Из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| В том числе: физических лиц | лиц | 3257 | 3213 |
| Из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 5 | 5 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | - | |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | - | |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | - | |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа___ | рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа___ | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа___ | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа___ | рублей | - | - |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | - | Х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | - | Х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | - | Х |
| Количество акций находящихся на балансе общества, – всего | штук | 0 | 0 |

**Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 31432 | 26976 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 33462 | 29591 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | -3795 | -2774 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | -2030 | -2615 |
| Прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -2259 | -199 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | 494 | 39 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | -3795 | -2774 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 907 | 6024 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | - | - |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 74545 | 58683 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 484 | 597 |

**Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета):** 41200 – ОБЩЕЕ СТРОИТЕЛЬСТВО ЗДАНИЙ – 68,5 %

**Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год:** 29 марта 2024 г.

**Дата подготовки аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности:** 18 марта 2024 г.

**Наименование аудиторской организации (фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) индивидуального предпринимателя), местонахождения (место жительства), дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей:** ООО «Белросаудит», Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, 89, кор. 3, пом. 4, дата регистрации 28.04.2000, регистрационный номер в ЕГР 600506719.

**Период, за который проводился аудит:** с 01.01.2023 по 31.12.2023 г.

**Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушений:** аудиторское мнение с оговоркой, бухгалтерская отчетность ОАО «Минский домостроительный комбинат» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Минский домостроительный комбинат» по состоянию на 31.12.2023 года, а также финансовые результаты его деятельности и изменение финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

УНП 100258980

---

УНП 291442411

В дополнение к извещению
о проведении публичных электронных торгов (аукциона),
опубликованному 26.04.2024 в газете «Звязда» № 83 (30217), стр. 21.
Аукцион по продаже лота № 2 состоится 30.05.2024,
начало: 10.00, окончание: 16.00
на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by.
Время приема заявок: с 30.04.2024 09.00 до 29.05.2024 г. 17.00.

---

## ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Гомельхлебпром» (продавец) извещает о проведении <u>31 мая 2024 года открытого аукциона</u> по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условия продажи:** срок разработки проектной документации не более двух лет с даты заключения договора купли-продажи, срок начала реконструкции приобретенного имущества в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации и срок их окончания – нормативный срок согласно разработанной и утвержденной проектной документации. За неисполнение обязательных условий продажи покупатель уплачивает штраф в размере трех процентов от цены продажи недвижимого имущества. В течение одного года после уплаты либо поступления первого платежа в счет уплаты указанного штрафа покупатель устраняет допущенные нарушения. Неисполнение обязательных условий продажи по истечении двух лет после уплаты либо поступления первого платежа в счет уплаты указанного штрафа, а также неуплата указанного штрафа являются основанием для расторжения договора купли-продажи по соглашению сторон либо по решению суда. При расторжении договора купли-продажи недвижимое имущество возвращается продавцу, в том числе с учетом выполненных покупателем неотделимых улучшений, без возмещения их стоимости, без возврата покупателю денежных средств, уплаченных им за недвижимое имущество. Не допускается залог приобретенного имущества, а также удовлетворение за счет него требований кредиторов в процессе экономической несостоятельности (банкротства) до выполнения покупателем обязательных условий продажи. До истечения срока выполнения обязательных условий продажи допускается отчуждение покупателем недвижимого имущества по согласованию с Гомельским областным исполнительным комитетом, а также отчуждение такого имущества в процессе исполнительного документа или ликвидации покупателя с сохранением обязательств по исполнению обязательных условий продажи за новым покупателем. При этом на нового покупателя распространяется ограничение по залогу и удовлетворению требований кредиторов в процессе экономической несостоятельности (банкротства) | | | |
| 1 | - **Капитальное строение** с инв. № 322/С-16607 общей площадью **4555,6 кв. м**, наименование – здание главного корпуса хлебзавода; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-16601 общей площадью **410,7 кв. м**, наименование – одноэтажное кирпичное здание материального склада; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-17955 общей площадью **372,1 кв. м**, наименование – гаражи с пристроенным складом; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-17957 общей площадью **55,1 кв. м**, наименование – одноэтажное бетонное здание склада; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-16606 общей площадью **17,8 кв. м**, наименование – одноэтажное кирпичное здание проходной; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-18311 общей площадью **575,0 кв. м**, наименование – двухэтажное кирпичное нежилое здание административного корпуса; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-22791 общей площадью **65,8 кв. м**, наименование – холодильник; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-22792 общей площадью **5,9 кв. м**, наименование – здание для обслуживания артскважин; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-16603 общей площадью **178,3 кв. м**, наименование – магазин № 2 «Горячий хлеб»; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-30306, общей площадью **69,0 кв. м**, наименование – резервуар противопожарный; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-30299 протяженностью **39,6 м**, наименование – внеплощадочные сети канализации от производственной территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачёв; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-30298 протяженностью **507,7 м**, наименование – Внутриплощадочные сети канализации на производственной территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачёв; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-30303 протяженностью **296,3 м**, наименование – электроосвещение территории по ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачёв; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-30304 протяженностью **251,8 м**, наименование – хозяйственно-производственный водопровод на производственной территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачёв; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-30300 протяженностью **79,5 м**, наименование – газопровод к зданию главного корпуса по ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачёв; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-30301 протяженностью **90,8 м,** наименование – кабельная линия КЛ-10кВ № 2042 на территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачёв; **- Капитальное строение** с инв. № 322/С-30302 протяженностью **653,3 м**, наименование – кабельная линия КЛ-10кВ № 134 к производственной территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачёв.<br>**Объекты расположены** на земельном участке с кадастровым номером **324750100003001372 площадью 2,9421 га** (право постоянного пользования) по адресу: Гомельская обл., Рогачёвский р-н, г. Рогачёв, ул. Сергея Кирова, 35.<br>**Также в состав лота № 1 входит:**<br>- Кабельная линия (пряничный цех), инв. № Р021008; - Паропровод, инв. № Р021012; - Мукопровод, инв. № Р021011; - Артскважина, инв. № Р0010024; - Артскважина, инв. № Р0010021; - Зеленые насаждения, инв. № Р0000461; - Зеленые насаждения, инв. № Р0000382; - Термостат ТС 80 М-2, инв. № Р0000040; - Система сбора телеметрии ИДНЛ-170, инв. № Р0000134; - Весы автомобильные, инв. № Р0000255; - Холодильная камера, инв. № Р0000263; - Подкатной двухголовочный автомат ДАС-600, инв. № Р0000267; - Автоматическая система дозирования муки и жидких компонентов, инв. № Р0000281; - Печь пряничная PTG, инв. № Р0000288; - Фильтр обезжелезования, инв. № Р0000375; - Морозильная камера, инв. № Р0000369; - Емкость 1,5 куб. м, инв. № Р0000768; - Трансформатор 400/10, инв. № Р0000820; - Регулятор реактивной мощности, инв. № Р0000824; - Бак металлический 8 куб. м, инв. № Р0000917; - Измерительный комплекс СГ-ЭКВ-Р-05-65/16, инв. № Р0000923; - Дозатор сыпучих компонентов, инв. № Р00502; - Узел коммерческого учета газа, инв. № Р0200790; - Котел КП 0,5 в комплекте с горелкой, инв. № Р0200838; - Котел КВ 0,36 в комплекте с горелкой, инв. № Р0200839; - Шкаф управление котельной, инв. № Р0200840; - Уравнитель гидравлический ДУ-100 котельной, инв. № Р0200841; - Насос сетевой 12033 в котельной, инв. № Р0200842; - Насос сетевой МН1203 в котельной, инв. № Р0200843; - Насос сетевой МКО ДР 40/115-0.55/2 в котельной, инв. № Р0200844; - Бак водомерный БС-100 заквасочное отделение, инв. № Р0200845; - Станция дозировочная СДМ 4х6 заквасочное отделение, инв. № Р0200846; - Бак водомерный БС-100 заквасочное отделение, инв. № Р0200851; - Насос сетевой МН1203 в котельной, инв. № Р0200852; - Насос сетевой 12033 в котельной, инв. № Р0200855; - Насос сетевой МН1203 в котельной, инв. № Р0200854; - Котел КП 0,5 в комплекте с горелкой, инв. № Р0200856; - Аппарат для охлаждения воды, инв. № Р0200858; - Бак расширительный в котельной, инв. № Р0200860; - Клапан регулирующий КРПС в котельной, инв. № Р0200861; - Установка умягчения воды в котельной, инв. № Р0200862; - Установка контроля времени в заквасочном, инв. № Р0200863; - Камера холодильная КХМ-9, инв. № Р020900; - Камера холодильная, инв. № Р020927; - Котел варочный, инв. № Р020934; - Автоматизированная станция управления дозированием муки, инв. № Р020955; - Инженерная система охлаждения (кулеров), инв. № Р020961; - Холодильный агрегат amz-120, инв. № Р020962; - Автоматизированная система дозирования муки, инв. № Р020964; - Автоматизированная система дозирования жидких компонентов, инв. № Р020965; - Технологическая линия приготовления заквасок по 4-стадийной технологии, инв. № Р020966; - Мойка нерж, инв. № Р020981; - Баки для муки - (2 ед), инв. № Р020982; - Система видеонаблюдения хлебозавода, инв. № Р1111163; - Теплообменный аппарат двухсекционный, инв. № Р0000378; - Водомерный узел, инв. № Р0000464; - Щит распределительный ШР-11, инв. № Р0000813; - Щит распределительный ШР-11, инв. № Р0000814; - Щит распределительный ШР-11, инв. № Р0000815; - Щит распределительный ШР-11, инв. № Р0000816 | **2 603 856,00** | 130 192,80 |

**<u>Продавец:</u>** открытое акционерное общество «Гомельхлебпром», 246045, г. Гомель, ул. Интернациональная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляются по контактному тел. **8 (029) 122-89-32 – Бондаренко Юрий Владимирович.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **<u>Продавца торгов</u> (открытое акционерное общество «Гомельхлебпром»):** р/с BY55 BLBB 3012 0400 0106 7400 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400010674, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 30 апреля 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 29 мая 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **<u>5 (пять) %</u>**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **<u>Продавцом</u>** в течение **<u>5 (пяти) рабочих дней</u>** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **<u>3 (трех) рабочих дней</u>** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **<u>3 (трех) рабочих дней</u>** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **<u>10 (десяти) рабочих дней</u>** с момента подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество Продавцу в размере 30 % от цены продажи имущества в течение **<u>15 (пятнадцати) календарных дней</u>** с момента заключения договора, 70 % от цены продажи ежемесячно равными долями в течение календарного года с момента заключения договора с индексацией платежей в соответствии с постановлением государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 22.10.2019 г. № 14 «О порядке расчета платежей при рассрочке оплаты стоимости государственного имущества». Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – <u>www.expert-usluga.by</u> (раздел «Аукционы»).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – <u>www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»</u>, Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: тел.: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

# УВАЖЛІВАСЦЬ І ПРАВІЛЫ БЯСПЕКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Такім чынам, у кожнай краіне павінен быць вызначаны дзяржорган, які адказвае за такія пытанні. У Беларусі гэта Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, яно з'яўляецца галоўным каардынатарам такой работы і надзелена правамі ў распрацоўцы нарматыўных прававых актаў.

— Галоўны дакумент — Закон аб ахове працы, прыняты ў 2008 годзе, які мы неаднаразова ўдасканальвалі і працягваем гэта рабіць. У план законапраектаў на 2025 год збіраемся ўключыць Закон аб ахове працы, каб удасканаліць асобныя моманты, перш за ўсё наяўнасць сістэмы кіравання аховай працы ў арганізацыях. Улічаючы, што галоўная задача — прафілактыка і выяўленне рызык, хочам гэту тэму развіць у законе, — падкрэсліў Ігар Старавойтаў.

Акрамя названага закона, прававая база па ахове працы ўключае больш за 100 нарматыўных дакументаў. 16 студзеня 2024 года быў прыняты чарговы дакумент — пастанова Савета Міністраў № 36, якая ўнесла змены ў правілы расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці. Ён выкладзены ў новай рэдакцыі і ўступіў у дзеянне з 26 студзеня.

Сярод навацый у дакуменце вызначана паняцце «грубая неасцярожнасць». Калі работнік яе дапускае, для яго наступаюць сур'ёзныя наступствы, у прыватнасці, ад гэтага залежаць выплаты, якія ён атрымлівае. Раней наймальнікі пры правядзенні самастойнага расследавання сутыкаліся з пэўнымі праблемамі. Новае паняцце дакладна тлумачыць многія моманты, у тым ліку звязаныя з алкагольным ап'яненнем. Атрыманне траўмы ў такім стане, дарэчы, таксама адносіцца да грубай неасцярожнасці. Акрамя таго, дакумент закранае новыя формы, у прыватнасці дыстанцыйную работу, і тлумачыць, як праводзіць расследаванне ў дадзеным выпадку.

Наглядным органам, які прымяняе пэўныя меры адказнасці, з'яўляецца Дэпартамент дзяржінспекцыі працы. Адказнасць за грэбаванне правіламі аховы працы прадугледжана ў Кодэксе аб адміністрацыйных парушэннях. Прычым не толькі для наймальніка, але і для работніка: за парушэнні ён можа быць прыцягнуты да адказнасці штрафам да пяці базавых велічынь.

Летась дэпартамент актыўна праводзіў наглядную дзейнасць: правёў 415 выбарачных пазапланавых праверак, 2465 маніторынгаў, 679 спецыяльных расследаванняў няшчасных выпадкаў на вытворчасці. І выявіў 42 тысячы парушэнняў, пасля чаго яны былі выпраўлены. Звыш 11 тысяч работнікаў было адхілена ад работы. Гэта людзі, якія або не прайшлі інструктаж па ахове працы, або знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

— Такім чынам, у пэўнай ступені прадухілена 11 тысяч патэнцыяльна магчымых няшчасных выпадкаў, — адзначыў намеснік міністра. — Нярэдка наймальнікі хаваюць няшчасныя выпадкі на вытворчасці, хоць у адпаведнасці з правіламі яны павінны інфармаваць пра гэта дэпартамент. Калі выпадак няцяжкі, наймальнік сам праводзіць расследаванне, пры гэтым некаторыя наймальнікі сыходзяць ад гэтага, імкнуцца ўвайсці ў змову з работнікам і не расследаваць няшчасны выпадак. За мінулы год мы ўстанавілі 30 такіх выпадкаў, калі наймальнік імкнуліся іх схаваць. Адпаведныя службовыя асобы былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

У нашай краіне працягваюць працаваць мабільныя групы, якія створаны райвыканкамамі і гарвыканкамамі на месцах для аказання садзейнічання наймальнікам захоўваць меры бяспекі. Сёння дзейнічае 136 такіх мабільных груп, куды ўваходзяць усе наглядныя кантрольныя органы, але галоўная роля — у інспектараў Дэпартамента



дзяржінспекцыі працы. Больш за 60 % парушэнняў, якія ўстаноўлены, тычацца правіл аховы працы. Летась мабільныя групы правялі больш за 15 тысяч абследаванняў арганізацый, было устаноўлена 158 тысяч парушэнняў.

— Мы разумеем, што гэтыя парушэнні — патэнцыяльна магчымыя траўміраванні ці няшчасныя выпадкі. Па выніках работы мабільных груп выдаюцца адпаведныя рэкамендацыі, у пераважнай большасці выпадкаў яны выконваюцца. Выпадкі невыкання такіх рэкамендацый вельмі рэдкія, — адзначыў Ігар Старавойтаў.

## МЕНШ П'ЯНЫХ

Па колькасці няшчасных выпадкаў на вытворчасці летась зафіксавана некалькі станоўчых тэндэнцый. Перш за ўсё — зніжэнне колькасці выпадкаў гібелі на вытворчасці. У параўнанні з 2022 годам іх колькасць знізілася больш чым на 11 % (у 2022-м было 132 смяротныя выпадкі, у 2023-м — 117). Назіраецца зніжэнне колькасці выпадкаў гібелі і ў стане алкагольнага ап'янення, прычым амаль на 60 % (з 22 да 9 выпадкаў). Зафіксавана і зніжэнне агульнага траўматызму ў стане алкагольнага ап'янення — больш чым на 30 % (з 81 да 55 выпадкаў).

Аднак ёсць і негатыўныя тэндэнцыі. На 4 % вырас агульны траўматызм. Летась на вытворчасці было траўміравана 1850 работнікаў (1781 — у 2022-м). На гэта ёсць пэўныя прычыны, у прыватнасці, вырас траўматызм за кошт неасцярожнасці і няўважлівасці самога работніка пры адсутнасці шкоднага ці небяспечнага фактару.

Рост агульнага траўматызму летась назіраўся ў Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях. Што датычыцца частаты траўміравання на вытворчасці (гэта найбольш аб'ектыўны паказчык, які паказвае траўміраванне на 100 тысяч работнікаў), то па агульным траўматызме ён складае 50,3 (47,4 — у 2022 годзе). Затое знізіўся каэфіцыент са смяротным траўматызмам — з 3,5 да 3,2. Самы высокі каэфіцыент траўматызму, як агульнага, так і смяротнага, адзначаны ў Магілёўскай вобласці. Частата траўміравання складае 86, са смяротным зыходам — 4,3.

— Такія паказчыкі ў гэтым рэгіёне традыцыйныя, звязана гэта са структурай вытворчасці. Разам з тым мы звяртаем асаблівую ўвагу на сітуацыю ў вобласці, — патлумачыў намеснік міністра.

## СТАНОЎЧЫЯ ЗРУХІ

Сярод станоўчых момантаў — зніжэнне няшчасных выпадкаў па віне работадаўцы. Іх колькасць скарацілася з 21,9 % у 2022 годзе да 20,7 % у 2023-м. У тым ліку і са смяротным зыходам: з 45,4 % ў 2022-м да 43,4 % у 2023-м.

— Гэта сведчыць пра тое, што работа, якая праводзіцца ў рамках аховы працы як дэпартаментам, так і выканкамамі, дае вынікі, — дадаў Ігар Старавойтаў.

Ёсць пазітыўныя зрухі і ў саміх работнікаў — яны таксама сталі больш берагчы патрабаванні па ахове працы. У выніку знізілася колькасць траўміраванняў па віне работніка — па агульным траўматызме (з 42,8 % у 2022-м да 39,6 % у 2023-м) і са смяротным зыходам (з 52,6 % у 2022-м да 47,8 % у 2023-м).

— Мы бачым тэндэнцыю як у адносінах наймальнікаў, так і ў адносінах работнікаў, яна станоўчая. У 2023 годзе ўдзельная вага парушэнняў, дзе прысутнічала віна або наймальніка, або работніка, знізілася з 64,7 % у 2022 годзе да 60,3 % у 2023-м. Тэндэнцыя пазітыўная, — заўважыў Ігар Старавойтаў.

За кошт чаго ж назіраецца рост? Як адзначаюць спецыялісты, узрастае ўдзельная вага тых выпадкаў, калі работнік атрымлівае траўму па неасцярожнасці. На сёння гэта кожны пяты выпадак траўміравання. Работнік не парушае правіл аховы працы, пры гэтым траўміруецца па ўласнай неасцярожнасці. Часта гэта адбываецца пры хадзьбе па роўнай паверхні, калі, напрыклад, работнік абуў непадыходзячы абутак і паслізнуўся. Але траўмы ў такіх выпадках, як правіла, няцяжкія.

## СЯРОД ЛІДАРАЎ — ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА, БУДАЎНІЦТВА І ТРАНСПАРТ

Сярод асноўных прычын траўміравання — парушэнне працоўный дысцыпліны і патрабаванняў па ахове працы з боку пацярпелых. Гэта чвэрць ад усіх выпадкаў траўміравання і 16 % ад выпадкаў гібелі.

Як адзначае **начальнік упраўлення аховы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Іван КАРЧЭЎСКІ**, усе буйныя прадпрыемствы маюць выпадкі вытворчага траўматызму.

— Гэта нашы прамысловыя гіганты, дзе шмат работнікаў і вялікая колькасць тэхнікі і небяспечных відаў вытворчасцяў, тыя ж Мінскі трактарны завод, «Беларуськалій». Але няправільна лічыць, што там дрэнна арганізавана ахова працы. Той жа МТЗ рэгулярна займае прызавыя месцы ў аглядах-конкурсах, — звяртае ўвагу Іван Карчэўскі.

— На буйных прадпрыемствах пытанні па арганізацыі аховы працы якраз добра пастаўлены. Мы адчуваем гэта і па канферэнцыях, якія праводзім штогод. Прамысловыя гіганты абавязкова накіроўваюць сваіх спецыялістаў, дзе яны павышаюць кваліфікацыю, — дадаў Ігар Старавойтаў.

Сярод асноўных прычын гібелі — уздзеянне прадметаў і дэталяў, якія рухаюцца і разлятаюцца, у прамысловасці гэта станкі (27,6 % ад усіх выпадкаў траўматызму). Таксама падзенні пацярпелага падчас перасоўвання (больш 18 %), падзенні з вышыні (10 % і ў апошнія 2-3 гады іх колькасць расце), ДТЗ (10 %), падзенні і абрушэнні канструкцый будынкаў, абвалы (больш 7 %).

Калі казаць пра віну наймальнікаў, то пераважная прычына — невыкананне кіраўнікамі і спецыялістамі сваіх абавязкаў па ахове працы. Калі па агульным траўматызме па гэтай прычыне адбылося 10 % усіх выпадкаў, то са смяротным зыходам — амаль 15 %.

— Атрымліваецца, што ў нас як з боку работніка, так і з боку наймальніка невыкананне сваіх непасрэдных абавязкаў і патрабаванняў па ахове працы ўплывае на тое, што адбываецца. Мае значэнне і асабістая неасцярожнасць, гэта 20,1 % ад агульных прычын. Аднак гэта няцяжкія траўмы. Калі ж дадзеная прычына мае месца пры гібелі, то гэта ўсяго 2,9 % выпадкаў, — прыводзіць лічбы Ігар Старавойтаў.

Сярод лідараў у вытворчым траўматызме — прамысловасць, сельская гаспадарка, будаўніцтва, транспарт. У агульным траўматызме прамысловасць займае 32 %, сельская гаспадарка — 23 %, будаўніцтва — 12 %, транспарт — 7 %. Са смяротнымі выпадкамі сітуацыя крыху іншая: у будаўніцтва — 26 %, сельскай гаспадаркі — 25 %, прамысловасці — 20 %, транспарту — 15 %. Каэфіцыент частаты траўмавання па агульным траўматызме самы высокі ў сельскай гаспадаркі — 149, ён у тры разы вышэйшы, чым у цэлым па краіне. Па смяротным траўматызме лідзіруе будаўніцтва — каля 15, што амаль у 4,5 раза вышэй, чым па краіне.

## БЯСПЕЧНАЯ ПРАЦА НА ПРАЦЯГУ ТЫДНЯ. А ЛЕПШ — ГОДА

Праграма па ахове працы ўключана ў агульную праграму «Рынак працы і садзейнічанне занятасці насельніцтва» на 2021—2025 гады. Яна ўстанаўлівае паказчыкі, якіх неабходна дасягнуць. У прыватнасці, гэта скарачэнне колькасці работнікаў, занятых у шкодных умовах працы, і ўкараненне сістэмы кіравання аховай працы ў арганізацыях.

Летась колькасць работнікаў, занятых у шкодных умовах, склала 703 тысячы (гэта каля 16 % ад занятых у эканоміцы), у параўнанні з 2020 годам іх лік скараціўся на 7,6 % пры заданні ў 4 %.

— Скарачэнне звязана з удасканаленнем тэхнікі і тэхналогіі — заменай машын, абсталявання, удасканаленнем сродкаў калектыўнай абароны. Дзесьці 12 тысяч выведзена з умоў уздзеяння павышанага шуму, — адзначае Іван Карчэўскі.

Сістэмы кіравання аховай працы ўкаранёны ў 95 % арганізацый з колькасцю больш за 15 чалавек. Акрамя таго, праграма прадугледжвае мерапрыемствы, накіраваныя на прафілактыку вытворчага траўматызму. Сярод іх — «Тыдзень нулявога траўматызму». Праведзена 43 мерапрыемствы на абласным узроўні, 227 — на раённым і 162 — на галіновым. Тры рэгіёны не толькі падчас тыдняў нулявога траўматызму, але і ў цэлым не мелі ніводнага выпадку вытворчага траўматызму — гэта Калінкавічы, Брагінскі і Хоцімскі раёны.

Працягваецца практыка такіх прафілактычных мерапрыемстваў, як Год бяспечнай працы. Летась Год бяспечнай працы быў аб'яўлены ў прамысловасці.

— У арганізацыях, падпарадкаваных Міністэрству прамысловасці, летась не было ніводнага выпадку гібелі работнікаў на вытворчасці, а агульны траўматызм скараціўся на 10 %. Нягледзячы на тое, што прамысловасць — адзін з лідараў па траўматызме, пры правільнай арганізацыі работы можна дасягнуць станоўчага выніку, — рэзюмуе Іван Карчэўскі.

Нагадаем, што 2024-ы ў будаўніцтве аб'яўлены Годам бяспечнай працы. Будзем спадзявацца, што станоўчыя вынікі не прымусяць сябе чакаць і ў гэтай галіне.

**Алена КРАВЕЦ.**

# КРЫЛАТЫЯ АРЭЛІ

## Праверка на трываласць

— Бяспека атракцыёнаў дасягаецца пры выкананні трох умоў, — распавёў **начальнік упраўлення нагляду за бяспекай пад'ёмных збудаванняў і атракцыёнаў Дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці Пётр КЛІМКО.** — Важнейшая ўмова — справны атракцыён, і гэта ў першую чаргу зона адказнасці ўладальніка.

Сёння ў нашай краіне 52 арганізацыі розных формаў уласнасці ажыццяўляюць эксплуатацыю 186 атракцыёнаў, расказаў спецыяліст.

— Другі складальнік — арганізацыя бяспечнай эксплуатацыі, якая прадугледжвае наяўнасць асоб, адказных за справны стан атракцыёна, а таксама абслуговага персаналу, што мае адпаведную рабочую прафесію, згодна з якой можа быць дапушчаны да эксплуатацыі атракцыёнаў. І зноў гэта зона адказнасці ўладальніка атракцыёна, — падкрэсліў Пётр Клімко. — І трэцяя ўмова бяспекі на атракцыёнах — выкананне наведвальнікамі патрабаванняў і правілаў карыстання, размешчаных на інфармацыйных стэндах побач з атракцыёнам або пры ўваходзе на яго.



Спецыялісты Дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці ўздзельнічаюць у выкананні двух першых «складальнікаў бяспекі», адзначыў спікер:

— Мы праводзім тэхнічны агляд атракцыёнаў, гэта агляданне і выпрабаванні з нагрузкай і без нагрузкі, — удакладніў спецыяліст. — Таксама эксперт правярае арганізацыю бяспечнай эксплуатацыі збудавання. І толькі калі і першае, і другое выконваецца бездакорна, атракцыён вытрымлівае выпрабаванне, і эксперт дае станоўчую адзнаку па тэхнічным аглядзе.

А непасрэдны допуск атракцыёна да работы ў адпаведнасці з «Правіламі па забеспячэнні прамысловай бяспекі атракцыёнаў» ажыццяўляе прадстаўнік уладальніка атракцыёна, дадаў Пётр Клімко. Гэта работнік, на якога ўскладзены функцыі па ажыццяўленні кантролю ў сферы прамысловай бяспекі. Ён яшчэ раз пільна ўпэўніцца, што канкрэтны персанал на канкрэтным атракцыёне мае адпаведную прафесію і кваліфікацыйны разрад, што ёсць інструкцыі для персаналу і станоўчы вынік тэхагляду. У гэтым выпадку ён афармляе допуск з запісам яго ў пашпарт аб'екта.

— З пачатку гэтага года па заяўках уладальнікаў праведзены 43 тэхнічныя агляды атракцыёнаў, — звярнуў увагу начальнік упраўлення. — Усе — са станоўчым вынікам. Нашы эксперты па ўсёй краіне праводзяць гэту работу.

Зрэшты, дэпартамент у адказе не за ўсе атракцыёны ў парках краіны. Як растлумачыў спікер, зона адказнасці гэтай арганізацыі — толькі механізаваныя атракцыёны (іх у Беларусі 143) і водныя горкі (такіх 44). Непаднаглядныя дэпартаменту, у прыватнасці, тыя атракцыёны, дзе няма вялікіх хуткасцяў і вышынь, то-бок каруселі для маленькіх. Не кантралююцца ім таксама надзіманыя горкі і лабірынты.

— Але ёсць правілы па тэхнічнай бяспецы надзіманых атракцыёнаў, у адпаведнасці з якімі яны павінны падвяргацца выпрабоўванням на бяспеку не радзей аднаго разу ў год, — распавёў Пётр Клімко. — Гэтыя выпрабоўванні праводзяць арганізацыі, акрэдытаваныя Дзяржстандартам.

Спецыяліст асабліва падкрэсліў: бацькам, перад тым як запусціць дзяцей на надзіманыя атракцыёны, важна пераканацца, што побач ёсць інфармацыйны стэнд, азнаёміцца з інфармацыяй аб правядзенні выпрабоўвання на бяспеку, а таксама праінструктаваць дзяцей аб правілах паводзін на атракцыёне.

— Ад гэтага залежаць бяспека вашых дзяцей і ваш спакой, — рэзюмаваў Пётр Клімко.

## Для вялікіх і маленькіх

Добрая навіна: гэтым летам цэны на атракцыёны застануцца нязменнымі і не перавысяць узровень мінулага года. Сярэдні кошт — 2,5 рубля на адзін атракцыён. Пра гэта расказаў **намеснік генеральнага дырэктара, галоўны інжынер УП «Мінскзеленбуд» Руслан КАСЕВІЧ.**

Усяго катацьмінчан у гэтым цёплым сезоне будуць 50 атракцыёнаў (25 — у парку Горкага, 17 — у парку Чалюскінцаў і 8 — у парку 900-годдзя Мінска). Усе каруселі аснашчаны інфармацыйнымі стэндамі, вогнетушыцелямі, сродкамі аказання першай медыцынскай дапамогі, а супрацоўнікі атракцыёнаў і ігравога абсталявання забяспечаны сродкамі індывідуальнай аховы. Акрамя непасрэдна атракцыёнаў, работа перад адкрыццём сезона праводзілася на ўсёй тэрыторыі паркаў, удакладніў прадстаўнік «Мінскзеленбуду».

Стартаваў 26 красавіка і сезон работы фантанаў:

— Іх у нас на балансе 39, — дадаў спецыяліст.

Выхаднымі днямі ў парках імя Горкага і Чалюскінцаў будуць панядзелак і аўторак, а ў парку імя 900-годдзя Мінска — панядзелак, аўторак і серада. У будныя дні атракцыёны ўсю вясну і лета будуць працаваць з 11.00 да 21.00 (дзіцячыя пляцоўкі пачынаць работу будуць раней — з 10.00). У пятніцу, суботу, перадсвяточныя і святочныя дні працаваць каруселі будуць з 11.00 да 22.00.

Летась сталічныя паркі наведала каля 19 тысяч чалавек, паведаміў Руслан Касевіч. Сёлета супрацоўнікі спадзяюцца на такую ж высокую цікавасць мінчан, бо сталічным паркам ёсць што прапанаваць наведвальнікам.

— У мінулым годзе ў парку Чалюскінцаў і 900-годдзя Мінска ўстаноўлены два новыя батутныя комплексы. У парку Горкага з'явіўся басейн з электравудачкамі «Акватыка», — расказаў спецыяліст. — Закуплены два 5D-атракцыёны, яны размешчаны ў парках Горкага і Чалюскінцаў. Новая інтэрактыўная пляцоўка «Лукамор'е» мінулым летам адкрылася ў парку Горкага. У гэтым сезоне ў парку Чалюскінцаў з'явіцца яшчэ адзін атракцыён — чакаем пастаўку ў сярэдзіне сезона.

Ну а самыя любімыя ў сталіцы атракцыёны — гэта супрацоўнікі паркаў вызначаюць па колькасці наведванняў за сезон — традыцыйна «Кола агляду» (яго вышыня — 54 метра), «Аўтадром» і «Вальс».

Зрэшты, сталічныя паркі ўлічваюць інтарэсы не толькі дзяцей, падлеткаў і моладзі, але і наведвальнікаў сталага ўзросту.

— У парку Чалюскінцаў, нягледзячы на капрызы надвор'я, з 6 красавіка працуе праграма «Для тых, хто малады душой», — расказала **начальнік сектара культурна-масавай і спартыўнай работы УП «Мінскзеленбуд» Лідзія ВЕЖНАВЕЦ.** — На танцы збіраюцца людзі старэйшыя за 45 гадоў: па суботах і нядзелях, з 16.00. Калі вы не займаецеся спортам або фітнесам, тады танцуйце — гэта бадзёрыць і паднімае настрой! А калі вы самотныя, то на такіх сустрэчах абавязкова знойдзеце сяброў. Больш за тое, тут стварающца пары, і мы рады, калі людзі сталага ўзросту знаходзяць адзін аднаго і пачынаюць жыць разам.

Калі ж прывычныя лакацыі вам надакучылі, то хутка з'явіцца новая: плануецца, што парк Уга Чавеса (на скрыжаванні вуліц Лідскай і Казіміраўскай, у мікраёне Каменная Горка) прыме наведвальнікаў ужо ў ліпені гэтага года.

— Там зманціраваныя чатыры атракцыёны — «Вальс», «Аўтадром», «Лабірынт» і дзіцячы прагулачны цягнік, — паведаміў Руслан Касевіч. — Закуплены два надзіманыя батутныя комплексы. Заключаны дагаворы на пастаўку яшчэ чатырох атракцыёнаў, сярод якіх 5D-кінатэатр і інтэрактыўны цір.

## Каб радасць не стала бядой

Лета — гэта, вядома ж, не толькі паркі. Гэта і гульні дзятвы ў дварах, і масавы адпачынак на вадаёмах. Каб радасць не стала бядой, важна памятаць аб правілах бяспекі, папярэджваюць прадстаўнікі праваахоўных органаў.

— У Мінску вызначана 12 месцаў масавага адпачынку, і практычна ўсе яны знаходзяцца каля вады. А стыхійных месцаў адпачынку мінчан — больш як сотня. Купанне дазволена на трох вадаёмах сталіцы — Цнянскае вадасховішча, Дразды і Камсамольскае возера, — сказаў **намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама Сяргей ПРЫГОДЗІЧ.** — Месцам адпачынку, размешчаным каля вады, супрацоўнікі міліцыі будуць аддаваць асаблівую ўвагу, — папярэдзіў ён.

Справа ў тым, што летась трое мінчан патанулі пры купанні на гэтых вадаёмах, растлумачыў спецыяліст, і ўсе трое — з прычыны ўласнай бестурботнасці: адзін плаваў у месцы, забароненым для купання; двое знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Ён дадаў, што за распіваннем спіртных напояў паблізу ад вадаёмаў міліцыя будзе пільна сачыць: парушальнікам пагражае прафілактычная гутарка, а злосным парушальнікам — адміністрацыйная адказнасць.

— У месцах масавага адпачынку міліцыя будзе несці службу ў пешым парадку, а таксама з выкарыстаннем сродкаў персанальнай мабільнасці, — падкрэсліў Сяргей Прыгодзіч. — Таксама будуць выкарыстоўвацца беспілотныя лятальныя апараты. Гэта неабходна, каб аператыўна адсочваць абстаноўку і прадухіляць няшчасныя выпадкі.

У мінулым годзе, расказаў прадстаўнік ГУУС Мінгарвыканкама, у месцах масавага адпачынку сталіцы было ўчынена 13 злачынстваў: гэта крадзяжы. Прычынай таму — зноў жа бестурботнасць грамадзян, якія надоўга пакідалі асабістыя рэчы без нагляду.

— Асабліва хачу звярнуцца да бацькоў, якія будуць адпачываць з дзецьмі: кантроль за дзецьмі каля вады павінен быць пастаянным! — падкрэсліў Сяргей Прыгодзіч.

Папярэджанне няшчасных выпадкаў з непаўналетнімі — важная задача напярэдадні летніх канікулаў і для прадстаўнікоў сферы адукацыі. Менавіта цяпер асаблівую ўвагу настаўнікі аддаюць навучанню школьнікаў бяспецы на дарогах, адзначыла **намеснік начальніка аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Святлана КІСЕЛЬ.** Праводзяцца адзіныя дні бяспекі дарожнага руху і розныя навучальныя мерапрыемствы. На сайтах устаноў адукацыі створаны спецыяльныя раздзелы па правілах дарожнага руху і паводзінах на вадзе. Асаблівая ўвага аддаецца бяспечнаму перамяшчэнню на сродках персанальнай мабільнасці (веласіпедах, самакатах, гіраскутарах і г. д.).

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

БЕЛ ВЭБ

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

Форма 1

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
31 марта 2024 г.

**ОАО «Банк БелВЭБ»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31.03.2024 | 31.12.2023 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 161 606 | 176 856 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | – | – |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 661 214 | 554 474 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 242 639 | 281 994 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 106 747 | 964 743 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 728 475 | 2 853 503 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 90 | 228 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 12 951 | 12 951 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 128 339 | 126 759 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 1 | 1 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 268 | 89 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | 557 | 557 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 42 649 | 43 301 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 5 085 536 | 5 015 456 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 393 | 91 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 769 561 | 1 026 252 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 3 404 255 | 3 097 058 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 85 505 | 99 125 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | – | 2 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | – | – |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 58 374 | 67 760 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 4 318 088 | 4 290 288 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 117 408 | 117 408 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | – | – |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 86 669 | 80 227 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | (12 707) | (12 390) |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 576 078 | 539 923 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 767 448 | 725 168 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 5 085 536 | 5 015 456 |

Форма 2

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
за 3 месяца 2024 года

**ОАО «Банк БелВЭБ»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | За 3 месяца 2024 года | За 3 месяца 2023 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 103 216 | 81 618 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 56 017 | 41 094 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 47 199 | 40 524 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 24 214 | 20 403 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 8 132 | 7 899 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 16 082 | 12 504 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 23 | 21 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 2 821 | 1 005 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 5 312 | 5 328 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 192 | 299 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | (16 007) | 32 859 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 6 696 | 16 638 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 40 653 | 37 256 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 770 | 633 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 52 909 | 5 571 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 10 717 | 211 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 42 192 | 5 360 |

Председатель Правления банка В.С. Матюшевский

Главный бухгалтер –
директор департамента
бухгалтерского учета
и налогообложения О.С. Турбина

Дата подписания: 18 апреля 2024 г.

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте **www.belveb.by** в разделе «Раскрытие информации/Годовая отчетность/Финансовые показатели/Отчетность/Отчетность в соответствии с требованиями Национальных стандартов (НСФО)/Квартальная отчетность за 2024 год».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 24.02.2023 № 6.
УНП 100010078.

# СВОЙ УРАДЖАЙ АРЭХАЎ

## Навуковец адказаў на пытанні чытачоў

**Заўсёды прыемна, калі артыкул выклікае чытацкую цікавасць. Пасля публікацыі матэрыялу «Эліксір жыцця», прысвечанага беларускай селекцыі фундуку і грэцкага арэха, у рэдакцыю тэлефанавалі чытачы з розных рэгіёнаў Беларусі. Каб знайсці адказы на іх пытанні, мы адправіліся ў Інстытут пладаводства.**

**«На маім дачным участку расце фундук. Тры гады таму атрымаў першы ўраджай. Быў ураджай арэхаў і ў 2022 годзе. А ў 2023-м на расліну напалі шкоднікі — яны пакідалі пасля сябе пустыя арэхі з дзіркамі ў шкарлупіне. З цікавасцю прачытаў у газеце «Звязда» інтэрв'ю з намеснікам дырэктара Інстытута пладаводства аб вырошчванні арэхаплодных культур. Хацеў бы прапанаваць любімай газеце расказаць аб тым, як можна абараніць расліну ад шкоднікаў.**

**Мікалай Якаўлевіч Карповіч, Віцебск.»**

— Калі чытач гаворыць аб пустых арэхах з дзіркамі ў шкарлупіне, з вялікай доляй верагоднасці размова ідзе аб пашкоджанні арэхавым даўганосікам, — расказвае **намеснік дырэктара па інавацыйнай працы РУП «Інстытут пладаводства» Віталь ВАСЕХА.** — Хімічныя спосабы барацьбы з гэтым шкоднікам распрацоўваюцца. Фундук для вырошчвання ў Беларусі культура новая, і каб даваць канкрэтныя рэкамендацыі, трэба правесці пэўныя даследаванні. Але існуе шэраг агратэхнічных спосабаў, здольных дапамагчы мінімізаваць шкоду.

Па-першае, гэта перакопка прыствольнага круга на глыбіню 25–30 см. Акрамя таго, на працягу ўсяго сезона (і асабліва ўвосень) абавязковыя збор і падчыстка ўсіх раслінных рэштак, у тым ліку апалых арэхаў з адтулінамі ў шкарлупіне ці такіх арэхаў, што засталіся на дрэве. Гэтыя плады важна знішчыць, пажадана спаліць.

Дачніку або гаспадару прысядзібнага ўчастка пры пасадцы фундуку вельмі важна прыглядацца да ствалоў, каб не прапусціць з'яўленне шкоднікаў, зазначае Віталь Валер'евіч. І нават калі шкоднікаў вы візуальна не выявілі, неабходна апрацоўваць ствалы фундуку садовымі фарбамі, якія ўтрымліваюць інсектыцыд. Гэта прафілактыка не толькі даўганосіка, але і іншых (не спецыялізаваных) шкоднікаў. Калі фундук вы фарміруеце як дрэва, такая апрацоўка праводзіцца да першага разгалінавання. Афарбоўка абароніць расліну і ад сонечных апёкаў увесну, і ад шкоднікаў. Гэтае мерапрыемства таксама пажадана правесці ўвосень. Калі ў складзе садовай фарбы няма інсектыцыду, прэпараты супраць шкоднікаў можна дадаць самастойна. Нават самыя простыя і базавыя інсектыцыды дазволяць мінімізаваць праблему на маючы адбыцца цёплы сезон. Зрэшты, нічога дрэннага не будзе, калі пафарбаваць ствалы таксама і ўвесну.

Існуюць пэўныя народныя падыходы да барацьбы са шкоднікамі раслін, якія нядрэнна працуюць на фундуку. Нельга сказаць, што яны даюць стопрацэнтны вынік, але паспрабаваць варта. Па-першае, пакуль фундук малады, на мяжы прыствольнага круга высадзіце аксаміткі, яны адпужваюць шашолак (даўганосіка). Таксама дрэнна пераносіць гэты шкоднік суседства з такімі духмянымі раслінамі, як цыбуля і часнок. З гэтым фактам звязаны яшчэ адзін спосаб прафілактычнай барацьбы: калі вы настойваеце на шалупіне цыбулі і/або часнаку водны раствор, разводзіце яго вадой у прапорцыі 1:1 і раўнамерна праліваеце ваш прыствольны круг (лепш за ўсё — са звычайнай садовай палівачкі), тлумачыць навуковец.

— Што датычыцца хімічных сродкаў абароны, то, як я ўжо казаў, на працягу аднаго-двух гадоў мы зможам даваць канкрэтныя рэкамендацыі, у тым ліку дачнікам. Арыентыровачна самыя крытычныя перыяды, калі можа адбыцца пашкоджанне фундуку насякомымі, — з другой паловы красавіка да пачатку чэрвеня. Менавіта ў гэты час асабліва важна праводзіць ахоўныя мерапрыемствы: збор раслінных рэштак, перакопку. Пабелку ствалоў, паўтаруся, можна адкласці на восень. Калі расліна дарослая і напад шкоднікаў — тая праблема, што паўтараецца з году ў год, трэба разумець, што за адзін сезон такімі агратэхнічнымі падыходамі вы яе не вырашыце, падкрэслівае суразмоўца. У гэтым выпадку ваша задача — мінімізаваць шкоду. Калі па суседстве іншых арэхаў не расце, з цягам часу праблема будзе вырашана.

— Але калі вы будзеце выконваць усе мерапрыемствы, а ваш сусед праз два дома нічога рабіць не будзе, або ваш участак знаходзіцца побач з лесам, то сітуацыя становіцца больш складанай. Паблізу ад лесу, дзе шмат ляшчыны, я не садзіў бы ў прынцыпе культурны фундук, таму што ў гэтым выпадку заўсёды ёсць і неспецыялізаваныя шкоднікі, якія прыходзяць, бо з'яўляецца новая ніша ў кармавой базе. А «жорсткая хімія» на дачным участку — не той варыянт, які варта ўжываць.

**«Як фарміраваць фундук у выглядзе дрэва?**

**Алена Мікалаеўна Пярловіч, Гомельская вобласць.»**

— Фарміроўка дрэвам цалкам апраўдана, калі ўчастак невялікі і вы хочаце пасадзіць некалькі розных сортаў фундуку. Пры гэтым варта ўлічваць: калі крона пачынаецца нізка, нязручна карыстацца касілкай і прыйдзецца нагінацца, выкарыстоўваючы рыдлёўку. Таму мы краніруем (абразаем) саджанец на вышыні 80—90 см і тым чынам выклікаем абуджэнне пупышак і фарміраванне кроны на патрэбнай нам вышыні. Ідэальны варыянт у дачным фармаце — фарміраваць чашападобную крону. Пасля кранiравання вы пакідаеце 3-4 найлепшыя, найдужэйшыя галінкі (яны будуць шкілетнымі), якія максімальна закрываюць прастору, разыходзячыся ў розныя бакі. І ўжо на іх вы будзеце фарміраваць ваш будучы ўраджай, усю вегетатыўную сферу дрэва. Асноўны прыём — гэта ўкарочванне. Потым у залежнасці ад сілы росту дрэва пасля заканчэння сезона (як правіла, гэта зімовае абразанне — люты — пачатак сакавіка) мы кароцім галінкі папярэдняга сезона прыкладна на адну траціну або адну чвэрць. Тым самым выклікаем нарастанне на нашы скарочаныя галінкі іншых галінак, на якіх далей будуць закладвацца ўжо пладовыя пупышкі, каб атрымліваць ураджай.

Звяртаю ўвагу садаводаў-аматараў, што крона фундуку павінна быць максімальна добра асветленай. Галінкі, якія канкуруюць адна з адной, перасякаюць і заглушаюць адна адну, абавязкова трэба выразаць. Не выражаеце ў гэтым годзе — у наступным, хутчэй за ўсё, прыйдзецца выразаць дзве з прычыны асаблівасцяў фізіялогіі фундуку. Загушчаная крона спрыяе горшаму выспяванню арэха, да таго ж загушчэнні — патэнцыйныя месцы, дзе можа ўтаіцца шкоднік або інфекцыя. Пры асветленай кроне арэх выспявае роўна і своечасова. Позняе паспяванне ў нашай кліматычнай зоне не ідзе на карысць ураджаю.

Калі мы пераходзім на кастрычнік у паспяванні арэха, у прынцыпе гэта не страшна, але патрабуе ад дачніка дадатковых намаганняў пры зборы і падрыхтоўцы арэха да захоўвання. Акрамя таго, можа адбіцца на тэрмінах захоўвання ўраджаю.



— Калі павінен выспяваць фундук у Беларусі?

— Гэта залежыць ад сорту. Ёсць раннія сарты, якія цалкам выспяваюць у другой палове жніўня. У сярэднім, калі казаць аб разнастайнасці сартоў, якія часцей за ўсё сустракаюцца ў Беларусі, гэта пачатак — канец верасня. Часам, калі жнівень выдаўся халодным, тэрмін паспявання самых позніх сартоў з раянаваных у нашай краіне можа ссунуцца на пачатак кастрычніка. Але калі па вашых назіраннях з году ў год ваш сорт спее пазней сярэдзіны кастрычніка, а ваш участак размешчаны не на поўдні Беларусі, а, напрыклад, у Віцебскай вобласці ці ў цэнтральных рэгіёнах краіны, ад такіх сартоў я раіў бы адмовіцца — яны ў нашых умовах не выспяваюць цалкам. Зразумела, што нават не зусім спелы арэх можна захоўваць і выкарыстоўваць у ежу, але тут ёсць яшчэ і біялагічны момант: расліна не завяршае ўсе свае працэсы да наступлення халадоў, не назапашвае неабходныя пажыўныя рэчывы і не гатовая да халадовага стрэсу. Адпаведна, пры суровай зіме ўзнікае рызыка страты расліны. Дзеля дачных эксперыментаў, вядома, можна вырошчваць што заўгодна, але я адмаўляўся б ад сартоў фундуку, у якіх арэх пачынае выпадаць з плюсак пасля 15 кастрычніка. Аптымальны варыянт для нашай кліматычнай зоны — збор ураджаю арэха за верасень.

**«Чым падкарміць фундук на працягу сезона?**

**Марына Кавальчук, Заслаўе.»**

— Мы мяркуем, што прыствольныя кругі ў нас чыстыя, перакапаныя, і мы трымаем іх пад чорнай парай. Адпаведна, нам будзе зручна ўносіць угнаенні. Асабліва хачу падкрэсліць: у прыствольным крузе пры вырошчванні фундуку не павінна расці травы (асабліва калі мы змагаемся з даўганосікам). Па краі, паўтаруся, можам прыгожа пасадзіць аксаміткі — гэта будзе працаваць не толькі на абарону расліны, але і на знешні выгляд саду.

Але вернемся да ўгнаенняў. І пачнём з пачатку — з падрыхтоўкі да новага сезона, якая пачынаецца восенню, пасля завяршэння сезона папярэдняга. Я прапанаваў бы ў якасці падкормкі тое, што ў нас можна масава купіць у крамах: суперфасфат і хлорысты калій. Па колькасці ўгнаенняў арыентуйцеся на ваш прыствольны круг, які, вядома, фарміруецца зыходзячы з праекцыі кроны. Арыенціровачна на квадратны метр плошчы ўносіцца 15-20 г хлорыстага калію і 15-20 г суперфасфату. Хлорысты калій — не самы лепшы варыянт, але фундук (у адрозненне ад іншых садовых культур — у прыватнасці буякоў) пераносіць хлор добра. Хоць, калі ёсць магчымасць, лепш, вядома, выкарыстоўваць сульфат калію. І калі вы ўносіце менавіта сульфат калію, то аптымальна зрабіць гэта ўвесну, вось непасрэдна цяпер. Зрэшты, можна зараз унесці пад фундук і хлорысты калій, і суперфасфат. Хоць лічыцца, што такія элементы, як фосфар і калій, мы ўносім у прыствольны круг усё ж увосень з задзелкай на глыбіню 5-10 см.

На працягу цёплага сезона падкормліваем фундук азотнымі ўгнаеннямі: гэта могуць быць аміячная салетра, карбамід і г. д. Нашы ўмоўныя 20 г (калі дрэва маладое) або 25 г на сезон (пры дарослай расліне) дзелім на тры часткі. Першую частку ўносім цяпер, наступныя — з інтэрвалам у два-тры тыдні (у залежнасці ад умоў надвор'я) у прыствольны круг з задзелкай. Калі надвор'е вільготнае і ёсць невялікі дождж, угнаенне можна проста рассыпаць — яно сыдзе ў зямлю само. Калі вы бачыце, што, нягледзячы на азотныя каранёвыя падкормкі, ліст у фундуку бледна-зялёны, што паказвае на недахоп азоту, дапамогуць пазакаранёвыя падкормкі. Сёння ў продажы прадстаўлена шмат азотных угнаенняў для пазакаранёвага ўнясення па лісту. У складзе могуць быць таксама магній, кальцый, іншыя мікраэлементы. Выбар ёсць — саставы і арганічнага паходжання, і мінеральныя. Падкарміце фундук два-тры разы за сезон у дозах, паказаных на пакаванні. Калі мы гаворым пра пазакаранёвае ўнясенне азотных угнаенняў па лісту, іх можна рабіць да 1 жніўня. Але каранёвае ўнясенне азоту важна цалкам завяршыць да сярэдзіны ліпеня, каб не выклікаць другаснага росту і іншых працэсаў, якія адаб'юцца на зімаўстойлівасці.

І яшчэ адна важная заўвага: пры выбары месца для пасадкі фундуку пажадана пазбягаць кіслых глеб.

— Глядзім на расліны-індыкатары: хвошч, конскае шчаўе і іншыя. Калі вы ўжо пасадзілі фундук на кіслыя глебы, можна змяніць кіслотнасць з дапамогай даламітавай мукі (300-400 г на квадратны метр). Робіцца гэтая працэдура восенню. Але важна разумець, што за адзін сезон кіслотнасць глебы прынцыпова змяніць не атрымаецца.

**«Чаму сёння ў дачнікаў такая цікавасць да арэхаплодных культур?**

**Ірына, Мінск.»**

